ШКОЛЬНЫЯ КАВЯРНІ: ЁСЦЬ ПАРУШЭННІ 7

СВЯТЛО НАДЗЕІ ГРЭКАВАЙ 12

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

16 ВЕРАСНЯ 2020 г. СЕРАДА № 180 (29294)

ЦЫТАТА ДНЯ

Іна КАРАБАН, начальнік аддзела гігіены, эпідэміялогіі і прафілактыкі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь:

«Вірус новы, і рабіць прагнозы вельмі складана. Разам з тым дадзеныя, якія ёсць цяпер у Беларусі і краінах свету, дазваляюць выказаць здагадку, што цячэнне другой хвалі COVID-19 будзе менш інтэнсіўным. Таму што перахварэла ўжо досыць вялікая колькасць насельніцтва. Мы разлічваем на тое, што вялікі працэнт перахварэлых мае антыцелы. І зараз відаць, што выпадкі захворвання ўжо не такія цяжкія, як былі ў першыя дні. Што датычыцца вакцынацыі ад каранавіруса, пакуль рана казаць пра якія-небудзь тэрміны. Зараз праходзяць клінічныя выпрабоўванні гэтай вакцыны. Спадзяемся, мы атрымаем яе пасля клінічных выпрабоўванняў, як і дамаўляліся кіраўнікі дзвюх краін».

На ўсе рукі гаспадар

Работнік Шаркаўшчынскага прадпрыемства по забеспячэнні насельніцтва палівам «Віцебскаблпаліва» Аляксандр БАЗІЛЬЧУК, нягледзячы на працу ў гарадскім пасёлку, па-сапраўднаму любіць і падтрымлівае сельскі лад жыцця. Ён пагаджаецца, што вёска не страціць свайго каларыту і самабытнасці, пакуль на падвор'ях будуць трымаць кароў і здаваць малако. Аляксандр пацвярджае гэта сваім прыкладам: на яго падворку гадуюцца дзве рагулі, гаспадар сам іх даглядае, выводзіць на луг і па традыцыі тройчы ў дзень доіць.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

РАТАЎНІКІ ШУКАЮЦЬ «РАБІНЗОНАЎ»

Як не згубіцца ў лесе?

Паход у лес — радасць бадай што для кожнага чалавека. Для жыхароў горада — гэта як мінімум магчымасць вырвацца на прыроду і застацца з ёй сам-насам, для вяскоўцаў — спосаб правесці час з карысцю, збіраючы ягады і грыбы. І ўсё б нічога, але і згубіцца ў лесе падчас вандровак вельмі проста, калі збочыць з вядомых сцежак.

СТАР. 8

Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

Цікавае пытанне

Медыцынскі турызм: паўза ці новы імпульс?

Чаму многія замежнікі выбіраюць для аздараўлення беларускія курорты і здраўніцы

Так званы медыцынскі турызм пачаў развівацца не так даўно. І хоць жыхары многіх краін наведвалі беларускія санаторыі і раней, але сапраўдны бум пачаўся некалькі гадоў таму. Ужо тры-чатыры гады колькасць такіх турыстаў толькі на Гродзеншчыне дасягае 20—30 тысяч чалавек у год. Гэтаму паспрыяў і безвізавы ўезд. Замежныя турысты прыязджаюць на прыём да гродзенскіх дантыстаў, хірургаў, у тым ліку пластычных, а таксама праходзяць абследаванне і дыягностыку. Большасць з іх сумяшчае медыцынскія працэдуры з аздараўленнем у беларускіх санаторыях.

Як паведамілі ў Гродзенскім абласным упраўленні Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні, дынаміка ў медыцынскім турызме відавочная. Рэкордным можна лічыць мінулы год, калі ў санаторыях вобласці пабывала 23 тысячы замежнікаў. Годам раней было на тысячу менш. У некаторых здраўніцах колькасць замежных турыстаў была нават большай, чым беларускіх.

СТАР. 9

КАРОТКА

- **Вытворчасць сельгаспрадукцыі ў Беларусі ў студзені—жніўні вырасла на 7,9 %**
- МАЗ гатовы пастаўляць тэхніку ў Лівію.
- **Праграму Манхэтэнскага фестывалю кароткаметражнага кіно пакажуць у Брэсце і Баранавічах.**
- Італьянскія арбітры рассудзяць матч брэсцкага «Дынама» і «Макабі» падчас Лігі чэмпіёнаў.

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал 2020 года

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

Парламенцкі дзённік

ПЕРАМЕНЫ ПРАЗ ДЫСКУСІЮ

Беларускія ўлады ўсведамляюць наспелую неабходнасць палітычных рэформаў у краіне

Аб гэтым заявіў старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах, кіраўнік дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Парламенцкай асамблеі АБСЕ Андрэй САВІНЫХ падчас анлайн-сустрэчы са старшынёй гэтай парламенцкай супольнасці Георгіем ЦЭРЭТЭЛІ.

Бакі абмеркавалі бягучую ўнутрыпалітычную сітуацыю ў Беларусі. Паводле слоў Андрэя Савіных, па выніках прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі перамогу атрымаў дзеючы Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. Яго перамога ўскосна пацвярджаецца і незалежнымі экспертамі — як у выніку экзітполаў, праведзеных прадстаўнікамі Расіі, Украіны, Швецыі і Сербіі, так і платформай «Голас».

«Тым не менш вынікі выбараў былі ўспрынятыя часткай беларускага грамадства контрпрадуктыўна, што прывяло да пратэсных акцый, у тым ліку несанкцыянаваных масавых мерапрыемстваў, гвалту ў дачыненні да супрацоўнікаў правапарадку, беспарадкаў на вуліцах краіны. Ёсць сведчанні, што дадзеныя акцыі арганізуюцца і фінансуюцца звонку, што з'яўляецца ўмяшальніцтвам ва ўнутраныя справы дзяржавы», — перадае ў паведамленні прэс-служба Палаты прадстаўнікоў.

На пытанне прадстаўніка АБСЕ адносна колькасці затрыманых і арыштаваных грамадзян, а таксама паведамленняў аб гвалце ў ізалятарах часовага ўтрымання дэпутат Савіных запэўніў, што пераважная частка затрыманых грамадзян ужо на волі, некаторыя з іх атрымалі толькі штрафы за парушэнне грамадскага парадку. У дачыненні да выпадкаў злоўжыванняў сілай праводзіцца праверка, створана міжведамасная рабочая група, якая старанна вывучае ўсе здарэнні.

У ходзе гутаркі Андрэй Савіных адзначыў, што беларускія ўлады ўсведамляюць наспелую неабходнасць палітычных рэформаў у краіне, у тым ліку надзялення большымі паўнамоцтвамі парламента і ўрада, а таксама неабходнасць унясення паправак у выбарчае заканадаўства і законы, якія рэгулююць правядзенне масавых мерапрыемстваў. Такія змены будуць разглядацца праз шырокае грамадскае абмеркаванне новай рэдакцыі Канстытуцыі. Да такога дыялогу прыцягнуць дзеючыя палітычныя партыі і грамадскія аб'яднанні, якія маюць афіцыйны статус.

На пытанне старшыні ПА АБСЕ аб тым, ці будзе ўдзельнічаць у такой дыскусіі Каардынацыйны савет, Андрэй Савіных адзначыў, што юрыдычны статус дадзенага аб'яднання да канца не зразумелы. Рыторыка яго прадстаўнікоў носіць неканструктыўны, рэвалюцыйны характар, што не дае ўладам магчымасці весці з імі перагаворы. У той жа час у дыскусіі адносна наспелых палітычных рэформаў абавязкова павінны прыняць удзел афіцыйна зарэгістраваныя ў краіне палітычныя партыі, грамадскія і прафесійныя аб'яднанні. Прапрацоўваецца алгарытм правядзення такіх перамоў.

Што датычыцца замежных партнёраў Беларусі, у тым ліку партнёраў па ПА АБСЕ, то Беларусь па гатоўнасці можа звярнуцца да калег па юрыдычную дапамогу з улікам назапашаных імі лепшых практык. Бакі дамовіліся і надалей падтрымліваць цесныя працоўныя кантакты.

Меркаванне

«СТРАТЭГІЧНЫ ПЛАН» АПАЗІЦЫІ НЕ БУДЗЕ МЕЦЬ ПОСПЕХУ»

Валянцін СЕМЯНЯКА, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце:

— Сумніўны «стратэгічны план» — не новая тактыка апанентаў улады. Ёю карысталіся і дзесяць і дваццаць гадоў таму, калі апазіцыя заклікала Еўрасаюз да санкцый супраць Беларусі. Ужо тады такім дзеянням, скіраваным супраць дабрабыту народа, была дадзена адпаведная ацэнка. І зараз новыя апазіцыянеры выходзяць з лозунгамі за змены, што павінны садзейнічаць дабрабыту. Але сваімі дзеяннямі яны паказваюць, што іх сапраўдныя мэты зусім у іншым.

Вось гэты лагічны ланцужок. Напачатку пратэсты, якія дэкларавaліся як «мірныя», сталі зусім не мірнымі, а скіраванымі на ігнараванне закона. Зараз — новая хваля з новымі супрацьзаконнымі формамі. У аснове «стратэгічнага плана» ляжыць ігнараванне нармальных адносін паміж грамадзянамі і дзяржавай. Трэба разумець, што калі мы хочам мець сацыяльныя гарантыі ў выглядзе бясплатнай медыцыны, адукацыі, сацыяльнай дапамогі, нізкіх тарыфаў на камунальныя паслугі, мы павінны выконваць свае грамадзянскія абавязкі ў поўным аб'ёме.

Лічу, што пісьменная і адказная частка беларускага грамадства не адрэагуе на прапановы «стратэгічнага плана» апазіцыі, якая заклікае не плаціць падаткі і не рабіць камунальныя плацяжы, не купляць айчынную прадукцыю, забіраць уклады з дзяржаўных банкаў. А тыя, хто паспрабуе такім чынам выказаць свой «мірны пратэст», сутыкнуцца з адпаведнымі санкцыямі заканадаўства. Асабіста я расцэньваю гэтыя заклікі «стратэгічнага плана» як чарговы папулісцкі крок апазіцыі, які не будзе мець поспеху.

Жніво-2020

ЗОЛАТА ПАЛЁЎ НА ПОЎНАЧЫ КРАІНЫ

Сёлета ў Прыдзвінскім краі плошча жніва павялічылася ў параўнанні з мінулым годам прыкладна на 10 %. Збожжавыя і зернебабовыя ўбіралі на 390 тысячах гектараў. Па папярэдніх ацэнках, агульная вага залатога ўраджаю Віцебшчыны можа дасягнуць каля 1,1 мільёна тон (разам з прыватным, фермерскім збожжам).



Асаблівасць сёлетняй «бітвы за ўраджай» — у вялікай падтрымцы з боку дзяржавы (Указ Прэзідэнта № 70 «Аб развіцці аграпрамысловага комплексу Віцебскай вобласці» ад 25 лютага 2020 года). Праект указа абмяркоўваўся ў Віцебску мінулай восенню. Ён даў магчымасць працаваць у новых умовах, у тым ліку фінансавых, тэхнічных, па-іншаму весці кадравую работу, замацоўваючы людзей у глыбінцы дадатковымі «бонусамі».

У Прыдзвінні, нагадаю, стварылі сем аграпрамысловых холдынгаў, якія аб'ядноўваюць каля 110 сельскагаспадарчых прадпрыемстваў (усіх іх — парадку 240). Новыя ўмовы дзейнасці дазваляюць і больш рацыянальна ажыццяўляць уборку ўраджаю.

Паводле слоў **намесніка старшыні Віцебскага аблвыканкама Барыса ЯФРЭМАВА,** добрай дапамогай сталі сто новых камбайнаў беларускай вытворчасці. Камбайны гэтыя, набытыя ў лізінг, былі тут неабходныя, напэўна, як ні ў адной іншай вобласці Беларусі. Справа ў тым, што парк гэтых сельскагаспадарчых машын на Віцебшчыне, мякка кажучы, адстаў ад патрэб часу. Каля паловы з прыблізна 1370 «крэйсераў палёў» даўно трэба было спісаць, бо яны і тэхналагічна, і маральна састарэлі... І таму ў некаторых гаспадарках на камбайн падчас бягучага жніва прыходзілася да 350 га — параўнальна вялікая плошча, і адпаведна, нагрузка на механізатараў.

Надвор'е, на жаль, не вельмі паспрыяла аграрыям. Як падкрэсліў Барыс Яфрэмаў, яно не парадавала земляробаў стабільнасцю. З-за практычна трохтыднёвых дажджоў не змаглі намалаціць мільён тон збожжавых яшчэ ў жніўні, хоць гэта было рэальна.

У Пастаўскім і Верхнядзвінскім раёнах жніво завяршылі першымі, у Віцебскім і Аршанскім раёнах рэкорд па намалоце — прыкладна па сто тысяч тон збожжа. Дарэчы, Аршаншчына, дзе працягваецца паскоранае развіццё згодна з адпаведным прэзідэнцкім указам, традыцыйна радуе добрым караваем. Сярэдняя ўраджайнасць на палях вобласці, як агучыў віцэ-губернатар, пад 31,5 ц/га.

Канчатковая ж мэта — каб алгарытм «ад поля да прылаўка» быў цалкам эфектыўны. Пры змяншэнні выдаткаў, выключэнні лішніх кіраўнічых звенняў і пасрэднікаў становіцца больш прывабнай цана прадукцыі, пры гэтым паляпшаецца яе якасць і канкурэнтаздольнасць, ёсць магчымасць цэнтралізавана павялічваць экспарт.

Ужо дакладна вядома, што абласны фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2020» пройдзе ў Віцебску і Віцебскім раёне 26 і 27 верасня. Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай Шарснёў анансаваў, што гэта будзе вельмі маштабнае свята, аналагаў якому раней не было. Абласны цэнтр актыўна рыхтуюць да яго правядзення — горад прыгажэе на вачах. Сярод новых аб'ектаў — гіганцкая арка ў прывакзальным скверы Кірава, якому надаюць новае жыццё. У папярэдняй праграме свята аграрыяў — шэсце ўдзельнікаў жніва, цырымонія ўзнагароджання ў Летнім амфітэатры, які ўмяшчае больш за 6,2 тысячы чалавек. А на падворках раёнаў, сельсаветаў пад адкрытым небам рыхтуюцца куліварныя і канцэртныя сюрпрызы.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Колькасць «кампаній-зомбі» ў ЗША наблізілася да максімуму

У ЗША вырасла колькасць так званых «кампаній-зомбі», якія не зарабляюць дастаткова для выплаты даўгоў, паведаміла Financial Times. Выданне звязвае гэта з прынятымі мерамі падтрымкі бізнесу, якія зрабілі карпаратыўныя пазыкі больш даступнымі. З 3000 амерыканскіх кампаній, якія ўваходзяць у індэкс шырокага рынку ЗША Leuthold 3000 Universe, да «зомбі» зараз можна аднесці 15 працэнтаў, паведаміла кіруючая кампанія Leuthold Group. Напрыканцы мінулага года такіх кампаній было 13 працэнтаў, а ў канцы крызіснага 2008-га — восем працэнтаў. Толькі адначасова «зомбі» было больш — у 2000-м, пасля краху даткомаў, іх доля дасягнула 16 працэнтаў, паведаміла Financial Times. «Гэта сапраўды турбуе нас, — расказаў выданню партфельны менеджар Leuthold Group Цзюнь Чжу. — Усё больш кампаній назапашваюць даўгі, і колькасць «зомбі» павялічваецца».

На Венеры знойдзены прыкметы жыцця



У атмасферы Венеры быў знойдзены газ фасфін, што можа сведчыць аб існаванні на гэтай планеце жыцця. Пра гэта група навукоўцаў з ЗША, Вялікабрытаніі і Японіі паведаміла ў часопісе Nature Astronomy. Прысутнасць фасфіну ў атмасферы Зямлі навукоўцамі асацыюецца выключна з «антрапагеннай дзейнасцю або прысутнасцю мікробаў», адзначаецца ў даследаванні. Гэты газ на нашай планеце вырабляюць мікраарганізмы, што існуюць у асяроддзі, якое не залежыць ад кісларoду, тлумачыць Reuters. Гаворка ідзе аб рысавых палях або, напрыклад, забалочанай мясцовасці. Выдзяляецца фасфін і ў выніку некаторых прамысловых працэсаў. Такім чынам, з'яўленне газу ў атмасферы Венеры застаецца для аўтараў даследавання невытлумачальным феноменам. Эксперты лічаць, што гэта можа быць як вынікам пакуль невядомых навуцы хімічных працэсаў, так і (па аналогіі з Зямлёй) сапраўды можа сведчыць аб наяўнасці там жыцця. Упершыню фасфін на Венеры навукоўцы выявілі з дапамогай тэлескопа Джэймса Клерка Максвела, які знаходзіцца на Гаваях. Затым яны пацвердзілі сваю знаходку з дапамогай тэлескопа ALMA ў Чылі.

У Паўднёвай Карэі створаць беспілотнікі, здольныя замяніць салдат

Рэспубліка Карэя інвестуе 2,3 мільярда долараў на працягу наступных 10 гадоў у распрацоўку ваенных беспілотных лятальных апаратаў (БПЛА). Пра гэта паведаміла паўднёвакарэйскае Агенцтва абаронных закупак (DAPA). «Плануецца стварыць некалькі відаў дронаў для выканання розных задач — ад разведвальных да баявых», — адзначаецца ў паведамленні. У прыватнасці, распрацоўшчыкі эксперыментуюць з установкай на невялікія дроны штурмавых вінтовак і гранатамётаў, што дазволіць замяніць у баі звычайных салдат. Адпаведныя тэхналогіі плануецца стварыць ужо да 2022-га, а на працягу наступных чатырох гадоў будуць весціся работы па непасрэдным стварэнні зброевай платформы.

Памяць

«ЗНЯСІЛЕНЫЯ, МЫ ІШЛІ ДАПАМАГАЦЬ»

28 гадоў таму ў Мінску з'явілася Беларускае таварыства блакаднікаў Ленінграда. У аб'яднання склаліся свае традыцыі. Штогод тут адзначаюць даты, якія для тых, хто перажыў 900 дзён і начэй у ачэпленым фашыстамі горадзе, у голадзе і холадзе, пад пастаяннымі бамбёжкамі і абстрэламі, маюць асаблівае значэнне.

Гэта дні, калі была адкрыта так званая дарога жыцця, калі да нормы ў 125 грамаў хлеба дадалі яшчэ 75, калі прарвалі варожае кольца і горад быў цалкам вызвалены. І, канешне, тут не забываюцца пра ахвяр: па розных даных, падчас блакады ў Ленінградзе загінула ад 600 тысяч да мільёна чалавек. Дзень памяці і смутку блакаднікі адзначаюць кожны верасень.

Пасля ўскладання кветак каля стэлы блакаднікі сабраліся ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. «1941 год. Па-летняму цёпла. Мы ведалі, што ідзе вайна, але не ведалі, што ўзяты ў кольца, аб гэтым было загадана не гаварыць, каб не стварацца паніку. На абарону сталі жанчыны, падлеткі, старыя, фабрыкі пераабсталявалі па воінскіх заказах усе станкі. Блакада Ленінграда не зламіла», — **старшыня Беларускага таварыства блакаднікаў Ленінграда Марыя ЯГАДЗІЦЫНА** справе распавесці і нават піша вершы пра тое, што адбывалася ў паўночнай сталіцы, хоць прызнаецца, што ўсе думкі і ўспаміны, звязаныя з той трагедыяй, выкласці немагчыма.

Не было ніводнай ленінградскай сям'і, якая ў тыя гады не страціла б сваіх блізкіх. Дзякуючы літаратурнаму подзвігу аўтараў «Блакаднай кнігі» Алеся Адамовіча і Данііла Граніна ўвесь свет мог даведацца пра маштаб той трагедыі, якую перажылі жыхары горада на Няве. А яшчэ пра тыя падзеі не перастаюць распавядаць іх непасрэдныя сведкі. Блакаднікі ўдзельнічаюць у патрыятычных акцыях, круглых сталах, сустракаюцца з дзецьмі і моладдзю. І ўсё для таго, каб памяць не згасала і падобная трагедыя ніколі не паўтарылася.

75-годдзе Вялікай Перамогі выдалася няпростым. «Гэта год барацьбы са спробамі перапісаць гісторыю, прынізіць маштаб подзвігу пераможцаў Айчыны, ролю Чырвонай Арміі і зганьбаваць вызваленчую місію, якую ўзяў на сябе савецкі салдат», — заўважыў падчас сустрэчы з блакаднікамі Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расійскай Федэрацыі Дзмітрый Мезенцаў. Ён адзначыў, што сёння, распавядаючы пра подзвіг, вельмі важна знаходзіць асобыя словы, якія будуць мець водгук у душах маладых людзей. І хто, як не жыхары непакорнага горада, змогуць лепш зрабіць гэта.

— Подзвіг ленінградцаў стаў сімвалам стойкасці духу, нязломнай сілы волі, любові да Радзімы, — заўважае Тамара Вішнякова.

Ёй вельмі цяжка згадваць тыя падзеі — падчас блакады сям'я Тамары Сямёнаўны страціла восем чалавек. «Дыстрафія ў мяне была страшная — усё балела. Але мы выхоўваліся па-гайдараўску. Шпіталь нам быў як дом родны. Настаўніца акампаніравала, а мы, дзеці, спявалі і танцавалі перад параненымі, людзьмі без ног і без рук. Калі ў шпіталь прывозілі прадукты, нас, дзяцей, падзывалі, давалі адну-дзве бульбіны, і мы гэты скарб неслі дамоў. Мы былі цімураўцамі — знясіленыя, хадзілі па дамах і пыталіся, ці можам, чым дапамагчы...»

Цімураўцамі блакаднікі застаюцца і зараз. Гэта закладзена нават у іх гімне, што створаны на матыў папулярнай некалі піянерскай песні «Арляня». У Беларусі яны аб'ядналіся не толькі, каб захоўваць памяць і праўду для будучых пакаленняў, але і каб дапамагаць адзін аднаму.

Спецыяльна да Дня памяці ахвяр блакады ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны адкрылася экспрэс-выстаўка «След блакады ў душах» — на ёй прадстаўлены архіўныя фотаздымкі, а таксама плакаты і малюнкі творчага аб'яднання «Баявы аловак».

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Слова чытачу

«ЗВЯЗДА» — ГЭТА КОМПАС ДЛЯ ВЫРАШЭННЯ ВАЖНЫХ ЖЫЦЦЁВЫХ ПЫТАННЯЎ

Аляксандр ВЯРСОЦКІ, старшыня Свіслацкага райвыканкама:

— Маё сяброўства са «Звяздой» пачалося, можна сказаць, з дзяцінства. Мае бацькі заўсёды выпісвалі найстарэйшую газету краіны, значным плюсам было і тое, што яна на роднай беларускай мове. Гэта сямейная традыцыя працягваецца і цяпер.

«Звязда» трывала ўвайшла ў маё жыццё, яна заўсёды на маім працоўным стале разам з іншымі выданнямі. Шмат карыснага для сябе знаходзіў у ёй цяпер у час работы на розных пасадах, бо матэрыялы вельмі разнастайныя. Падчас работы ў сферы культуры звяртаў увагу на матэрыялы па гэтай тэматыцы. Зараз, як прадстаўнік вертыкалі, знаходжу шмат карыснага ў дадатку «Мясцовае самакіраванне». Гэта свайго роду компас для вырашэння важных жыццёвых пытанняў. Што я маю на ўвазе? Напрыклад, карэспандэнт узнімае праблему пітной вады ў нейкім рэгіёне. Але яна сустракаецца паўсюдна ў малых населеных пунктах. Таму адсочваю гэты кірунак і ў сваім раёне, гляджу, як вядзецца работа з забеспячэннем якаснай пітной вадой у нашых вёсках і аграгарадках. Дарэчы, з многімі пытаннямі даводзіцца сутыкацца падчас прыёму грамадзян. У прыватнасці, якасць дарог, нарыхтоўка паліва і многае іншае. Перад дзяржавай стаіць задача стварыць у сельскай мясцовасці новую інфраструктуру, каб людзі тут жылі не горш, чым у горадзе. Такі курс вызначаны і кіраўніком дзяржавы. «Звязда» — стабільна ідзе дзяржаўным курсам. А значыць, канструктыўным. Асабліва важным лічу акцэнт на развіццё сяла. На гэту стратэгію скіравана і адпаведная дзяржаўная праграма.

Выданне не стаіць убаку ад надзённых актуальных палітычных праблем. І гэта вельмі важна, бо нашы людзі даверяюць найстарэйшай газеце краіны. Грамадзяне могуць прачытаць аб тым, які размах набыў рух «За Беларусь»: у краіне паўсюдна праходзяць канцэрты, шматлікія велапрабегі і акцыі. Усё гэта адлюстравана на старонках «Звязды».

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Пачалася вакцынацыя ад грыпу

З 15 верасня ў краіне стартавала кампанія па вакцынацыі супраць віруса грыпу. Яе больш ранні, чым звычайна, пачатак тлумачыцца распаўсюджваннем каранавіруснай інфекцыі.

— Прышчапляць сёлета мы пачалі раней. Каранавірусная інфекцыя здае пазіцыі, але працягвае цыркуляваць. Таму медыкам прыйдзецца сутыкнуцца з «двайной атакай». З гэтай прычыны зрабіць прышчэпкі ад сезоннага грыпу мы рэкамендуем усім, — адзначае **начальнік аддзела гігіены, эпідэміялогіі і прафілактыкі Міністэрства аховы здароўя Іна КАРАБАН.**

Яна адзначыла, што прышчапіць плануецца, як і ў апошнія гады, больш за 40 % насельніцтва. Летась, калі вакцыянавалі менавіта столькі, захваральнасць была мінімальнай, пачынаючы з 2008 года, — 6,1 чалавека на 100 тысяч насельніцтва.

— Вакцынацыя 40 % калектыву на прадпрыемствах дазваляе знізіць захваральнасць у 2,5 раза», — адзначыла спецыяліст.

Штогод вірусы грыпу муціруюць,таму і склад вакцыны мяняецца. Сёлета ён абноўлены па трох кампанентах.

— Працягласць захавання антыцелаў у арганізме — ад 6 да 12 месяцаў. Таму на пытанне «Ці варта рабіць прышчэпку, калі вакцыянаваўся летась?» адказ: «Так, варта», — падкрэсліла **загадчык лабараторыі грыпу і грыпападобных захворванняў РНПЦ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі, кіраўнік Нацыянальнага цэнтра па грыпу і іншых вострых рэспіраторных захворваннях Наталля ШМЯЛЁВА.**

Прышчэпка ад грыпу рэкамендуецца сёлета абсалютна ўсім — менавіта з-за распаўсюджвання COVID-19: ёсць верагоднасць адначасова заразіцца адразу дзвюма інфекцыямі.

— Прагназаваць складана, бо каранавірусная інфекцыя новая для чалавецтва, але ёсць падставы меркаваць, што другая хваля будзе менш інтэнсіўнай. Шмат людзей перахварэла і мае антыцелы, якія будуць захоўвацца, хочацца спадзявацца, каля паўгода. Ды і выпадкі зараз менш цяжкія, — адзначыла Іна Карабан. — Тым не менш групам рызыкі, асабліва пажылым людзям, старэй за 65 гадоў, не варта адмаўляцца ад вакцынацыі супраць грыпу. Бо наслаенне вірусаў грыпу і COVID-19 можа негатыўна адбіцца на іх здароўі.

Алена КРАВЕЦ.

Надвор'е

Апошнія цёплыя дзянькі?

Ужо з пятніцы нас чакае холад, вецер і дажджы

Восень — капрызлівая пара. Калі ў першай палове гэтага тыдня будзе пераважаць антыцыкланальны характар надвор'я з павышаным тэмпературным фонам, то ўжо ў чацвер усё пачне мяняцца. Атмасферныя франты прынясуць у нашу краіну дажджы, моцны парывісты вецер і істотнае пахаладанне, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Сёння ў нашу краіну завітае на дзень салатая сонечная восень. У гэтыя суткі будзе анамальна цёпла як уначы, так і удзень. 16 верасня будзе пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 8 да 15 цяпла, удзень — 22—29 градусаў. Гэта значыць, што ў некаторых раёнах будзе цёпла як летам!

Але надвор'е пачне мяняцца ўжо на наступны дзень. У чацвер уначы месцамі, пераважна па паўночным захадзе, раніцай і ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, у дзённыя гадзіны ў асобных раёнах магчымыя навальніцы. Уначы ў паўночна-заходніх раёнах, удзень месцамі па Беларусі прагназуецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Уначы і раніцай па паўднёвым усходзе чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 11 да 18 цяпла. Удзень будзе ад плюс 13 градусаў па паўночным захадзе да плюс 27 па паўднёвым усходзе краіны.

Істотнае пахаладанне мы адчуем у пятніцу. У гэты дзень пераважна па паўночным усходзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Месцамі прагназуецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе ўжо 3—8 цяпла. Удзень таксама будзе адносна холадна — 9—15 цяпла, і толькі па захадзе краіны — да плюс 17 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у выхадныя дні захаваецца халоднае надвор'е. Больш за тое, у начныя гадзіны месцамі па краіне, у асноўным на тарфяніках Палесся, спецыялісты прадказваюць першыя замаразкі. Праўда, яны чакаюцца слабыя, не больш чым ад нуля да мінус 2 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

Эка-прапанова

«ЗЯЛЁНАМУ» ТРАНСПАРТУ — ЗЯЛЁНАЕ СВЯТЛО

У краіне пачаўся Еўрапейскі тыдзень мабільнасці. Яго мэта — заклікаць уладальнікаў аўтамабіляў выкарыстоўваць альтэрнатыўныя віды транспарту. Аб гэтым расказала намеснік старшыні Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Таццяна ДУБІК.

— Падзея будзе доўжыцца да 22 верасня і завершыцца Сусветным днём без аўтамабіля. У гэты тыдзень мы павінны нагадаць усім пра негатыўны ўплыў аўто на навакольнае асяроддзе. Тэма падзеі сёлета — «Мабільнасць без шкодных выкідаў (Zero-emission mobility for all) — звязана з прасоўваннем нізкавугляродных відаў транспарту. Сёння да акцыі далучылася 68 населеных пунктаў краіны, у тым ліку Мінск. Так, у сталіцы 21—22 верасня будзе праведзены чарговы эксперымент па вымярэнні канцэнтрацыі забруджвальных рэчываў у атмасферным паветры і замеры ўзроўню шуму. Мэта — паказаць, як зніжаюцца выкіды і ўзровень шуму, калі жыхары горада адмаўляюцца ад выкарыстання асабістага аўтамабіля.

Падчас Еўрапейскага тыдня мабільнасці ў Мінску адкрыецца новы экамаршрут, які злучыць тры экалагічныя сцежкі Мінска: «Горад птушак», «Сярэбраны лог» і «Чыжоўку». Асаблівасць гэтага маршруту — магчымасць сумяшчэння велапрагулкі і назірання за птушкамі. Па ўсім маршруце будуць размешчаны інфармацыйныя стэнды, якія раскажуць пра крылатых жыхароў гэтых мясцін.

—У рамках падзеі пройдзе традыцыйнае мерапрыемства — акцыя «На працу на веласіпедзе». Гараджанам, якія будуць дабірацца на працу на такім відзе транспарту, у шасці пунктах горада прапануюць бясплатную садавіну, каву і гарбату. А ў Сусветны дзень без аўтамабіля, які адбудзецца 22 верасня, у кіроўцаў з'явіцца права бясплатнага праезду ў грамадскім транспарце пры прад'яўленні пасведчання кіроўцы і тэхнічнага пашпарта на аўтамабіль. Таксама для ўсіх ахвотных будзе арганізаваны велапрабег з удзелам кіраўніцтва Мінгарвыканкама і Мінпрыроды, — адзначыла Таццяна Дубік.

Упершыню падчас Еўрапейскага тыдня мабільнасці пройдзе таксама выстаўка «Транспарт сто гадоў таму».

Дар'я ШЛАПАКОВА.

«МЫ МОЖАМ МЕЦЬ РОЗНЫЯ ПАЛІТЫЧНЫЯ ПОГЛЯДЫ, АЛЕ МЫ РАЗАМ БУДЗЕМ ЖЫЦЬ У ГЭТАЙ КРАІНЕ»

Алег ГАЙДУКЕВІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах, — пра асаблівасці беларускіх пратэстаў, прапанову нацыянальнага дыялогу, звароты наконт гвалту праваахоўнікаў і новую палітычную рэальнасць.

house.gov.by/.

— На ваш погляд, у чым прычына пратэстаў: незадаволенасць уладай, непрызнанне выбараў грамадствам, уплыў знешніх гульцоў, канфлікт пакаленняў, жаданне новага класа «буржуйчыкаў» (аб якім казаў Прэзідэнт) прыйсці да ўлады?

— Я лічу, што тут комплекс перадумоў. Безумоўна, усе названыя прычыны маюць месца. Мы павінны разумець: знешнія фактары прысутнічалі ў выбарах з самага пачатку. Але без унутраных прычын ніякі знешні фактар ніколі не будзе эфектыўным. На мой погляд, мы сутыкнуліся яшчэ і з тым, што прыйшоў час рэфармаваць палітычную сістэму. Склалася сітуацыя, калі «як раней», ужо немагчыма. Неабходна рухацца наперад. Па майму меркаванню, рэформа павінна была быць яшчэ ў 2015 годзе, пасля мінулых прэзідэнцкіх выбараў. Яна актуальная і цяпер. Я маю на ўвазе змяненне выбарчага заканадаўства, пераход на выбары па прапарцыянальна-мажарытарнай сістэме і партыйных спісах. Зараз у нас аднамандатная сістэма акруг. Мінус яе ў тым, што ў акрузе будзе адзін пераможца (які набраў большасць галасоў), а чалавек на другім месцы ў органы ўлады не пападае. Яго электарат незадаволены, бо жадае, каб меркаванне таксама ўлічвалася на розных узроўнях заканадаўства ад райсаветаў да парламента. Пераходзячы да выбараў па партыйных спісах, усе кандыдаты, якія пераадолелі пяціпрацэнтны бар'ер, будуць прадстаўлены ў парламенце. Гэта дае магчымасць разнастайным поглядам быць агучанымі ў заканадаўчых органах. Такім чынам мы забяспечым кансэнсус у грамадстве. **Лёс краіны павінен рашацца не на плошчах і мітынгах, а ў парламенце і заканадаўчых органах шляхам дыялогу і эмацыянальнай дыскусіі. Для гэтага там павінны быць прадстаўнікі розных палітычных сіл**. Нам неабходна ў абавязковым парадку праводзіць рэформу.

— Вы кажаце пра змены — пераход да новай выбарчай сістэмы. Якія яшчэ навацыі неабходныя нашай Канстытуцыі?

— Я ўпэўнены, што нацыянальны дыялог па Канстытуцыі — той шлях, па якім мы павінны цяпер ісці, каб забяспечыць спакой і кансэнсус у грамадстве. На мой погляд, акрамя змянення выбарчага заканадаўства (прапісаць гэта неабходна ў Асноўным Законе краіны, гэта канстытуцыйнае пытанне), мы павінны яшчэ паглядзець на пераразмеркаванне паўнамоцтваў у эвалюцыйным шляху. Ні ў якім разе не павінна быць размовы аб вяртанні да старой Канстытуцыі 1994 года. У нас сістэма ўлады такая, што вялікая колькасць паўнамоцтваў у кіраўніка краіны. І гэта было запатрабавана ў свой час. Сёння размова ідзе пра тое, што мы павінны зрабіць сістэму больш устойлівай. Хто б ні прыйшоў да ўлады ў Беларусі, не важна, праз колькі гадоў, каб ён не змог радыкальна памяняць курс краіны. Так робіцца ва ўсіх дзяржавах: вазьміце ЗША, выбары ў Польшчы. Там розніца паміж кандыдатамі тры працэнты, зверхдэмакратычна. Але адзін момант, хто б у Польшчы ні стаў прэзідэнтам, радыкальна сістэму ўлады ён не зменіць, як і ў ЗША. Хто б ні атрымаў уладу, сістэма неабходна такая, што радыкальна нельга нічога змяніць. Для чаго? Каб не пачынаць усё нанова. Самае страшнае для Беларусі — усё з пачатку. Для гэтага ў Канстытуцыі неабходна ўзмацніць ролю парламента, выканаўчай улады, надаць ім больш шырокія паўнамоцтвы. Далей мы павінны паглядзець па рэгіёнах, каб мясцовая ўлада была больш самастойная ў рашэнні лакальных задач. Гэта, мабыць, тыя пытанні, якія трэба рашаць у ходзе нацыянальнага дыялогу па Канстытуцыі.

«Мы павінны разумець, што 9 жніўня мы прачнуліся ў новай палітычнай рэальнасці. Наша заканадаўства павінна зыходзіць з гэтага і адпавядаць таму, што адбываецца ў грамадстве і краіне».

— Улады часта называюць актыўным гульцом пратэстаў тэлеграм-канал Nexta. На ваш погляд, магчыма, што за платформай, якую стварыў юнак, стаяць сур'ёзныя структуры?

— Канечне, стаяць. Канал сёння мае ўплыў. Мы выдатна ведаем, што такое інфармацыйная палітыка — гэта грошы, падтрымка. У нас хапае ўнутраных праблем, якія мы павінны вырашаць, але, безумоўна, ёсць знешні фактар — спробы палітычных гульцоў скарыстацца пратэстамі ў краіне для рашэння сваіх пытанняў. У нас некаторыя палітычныя сілы гадамі фінансуюцца за межамі краіны. Я ўпэўнены, што ні адзін палітык, які фінансуецца з-за мяжы, ніколі не будзе адстойваць нацыянальныя інтарэсы, таму што ніхто пра нас там не турбуецца. Свае пытанні мы павінны вырашаць самі, ніхто за нас іх не вырашыць. Кожны спрабуе павярнуць сітуацыю ў сваіх геапалітычных мэтах. Як гэтаму супрацьстаяць? Першае — развіваць свае каналы. Проціпаставіць ілжы магчыма толькі праўду. Другое, людзі павінны бачыць, што іх чуюць. Чыноўнікам неабходна быць адкрытымі, гатовымі абмяркоўваць любыя праблемныя пытанні.

— Пратэсты ў Беларусі параўноўваюць з украінскімі, армянскімі, нават абхазскімі. Якія рысы нашых пратэстаў вы можаце вылучыць?

— Палітэхналогіі, якія выкарыстоўваюцца ў нас, ужо апрабоўваліся ў іншых краінах. Але не было ні адной краіны, дзе б вуліца і рэвалюцыя вырашылі нешта добрае. Станавілася толькі горш. Калі мы не будзем чуць людзей, гэта таксама да добрага не прывядзе. Павінен быць баланс. Першае: ніякіх рэвалюцый, нельга вырашаць лёс краіны на вуліцы. Другі момант — дыялог, рэформы, рух краіны наперад у рамках Канстытуцыі і закона. Што датычыцца асаблівасцяў пратэстаў, на мой погляд, рыса такая: нам удалося не скаціцца ў прорву. Сітуацыі ў краіне кантралююцца і застаюцца ў прававым полі. Я ўпэўнены, мы павінны пазбягаць гвалту, асудзіць яго, не дапускаць эскалацыі, старацца чуць адзін аднаго. Асаблівасць таксама такая, што ў нас не адбылася рэвалюцыя.

«Я лічу, што міжведамасная камісія — гэта добра, але неабходна стварыць яшчэ адну — парламенцкую».

— Існуе меркаванне, што ў беларускай апазіцыі няма дакладнай структуры, лідараў, таму не варта чакаць ад яе эфектыўнасці. Вы згодныя з такім меркаваннем?

— Я лічу, тыя, хто сёння выходзіць на вуліцу па нядзелях, не належаць да нейкай адной палітычнай сілы. Там людзі розных поглядаў. І калі будуць парламенцкія выбары, упэўнены, усе прагаласуюць за розныя партыі. Гэтыя людзі сёння нікому не належаць. У гэтым і складанасць, але гэта не адмяняе неабходнасці весці з імі дыялог. Яго можна весці ў працоўных калектывах, праз лідараў легальных партый, але галоўнай пляцоўкай павінен стаць парламент. Гэта той орган, які з'яўляецца агульнанацыянальнай пляцоўкай для дыялогу, куды можна прыцягнуць людзей. Для мяне няма іншай альтэрнатывы дыялогу. Пра гэта кажуць многія дэпутаты. Больш за тое, я наогул лічу, што мы павінны склікаць пазачарговую сесію, выступаў з гэтай ініцыятывай. Мае сэнс сабраць спецыяльную камісію ў парламенце, якая займалася б пытаннямі падзей у краіне. Я буду адстойваць гэту пазіцыю і далей. Ёсць людзі, якія выходзяць на пратэсты, а ёсць палітыкі, якія сядзяць за мяжой і стараюцца пратэсты накіраваць у неабходную для іх плынь.

— Відавочна, што немагчыма адмаўляцца ад таго, што ў першыя дні акцый праваахоўнікі праявілі жорсткасць у дачыненні да затрыманых удзельнікаў пратэстаў. Вы па просьбе сваіх выбаршчыкаў звярталіся да ведамстваў з запытамі. Якія адказы атрымалі ад праваахоўнікаў, ці будуць заведзены крымінальныя справы?

— Адказ я пакуль чакаю (інтэрв'ю праводзілася на мінулым тыдні — **«Зв.»**). Тэрміны яшчэ не выйшлі. Плюс мы чакаем вынікаў работы міжведамаснай камісіі. Запыт у людзей на гэта ёсць, самае галоўнае, каб усё было сумленна і законна. Па кожным факце павінны разабрацца не абстрактна, а індывідуальна. Прычым разабрацца і з правакатарамі, што дзейнічалі з боку пратэстоўцаў, і па кожным звароце чалавека па гвалце ў дачыненні да яго. Я спадзяюся, што мы разбяромся з усімі выпадкамі.

«Гэтыя людзі сёння нікому не належаць. У гэтым і складанасць, але гэта не адмяняе неабходнасці весці з імі дыялог».

— Колькі чалавек да вас звярнуліся са зваротамі пра гвалт праваахоўнікаў?

— Да мяне звярнуліся людзі не толькі з маёй дэпутацкай акругі, а з усёй краіны як да лідара партыі. Размова ідзе пра дзясяткі зваротаў. Я ведаю, што да многіх дэпутатаў таксама звярталіся. Згодна з законам аб зваротах грамадзян я не маю права ігнараваць гэтыя заявы. Я павінен іх адправіць у тыя органы, што праводзяць праверку.

— Наконт міжведамаснай камісіі. Там ёсць дэпутаты парламента?

— Ёсць толькі адзін. Я лічу, што міжведамасная камісія — гэта добра, але неабходна стварыць яшчэ адну — парламенцкую. Чым спакайней у рамках прававога поля мы разбяромся з усімі запытамі людзей, тым лягчэй нам будаваць дыялог. Мы ўсе павінны разумець, што мы можам мець розныя палітычныя погляды, але мы разам будзем жыць у гэтай краіне.

— У нашым заканадаўстве ёсць калізія. Каб мітынг быў легітымным, для яго неабходна атрымаць дазвол ад мясцовай улады. Зразумела, што пратэстоўшчыкам яго не дадуць, але ўсё роўна людзі выходзяць на вуліцу, парушаючы закон. Відавочна, закон не працуе. Ці плануецца яго змяняць?

— Мы павінны паважаць правы ўсіх людзей: і тых, хто выходзіць на пратэсты, і тых, хто хоча спакойна жыць. Мы павінны вылучыць дадатковыя месцы, акрамя існуючых, дзе людзі могуць збірацца і выказваць сваю палітычную пазіцыю. **Я лічу, што закон аб масавых мерапрыемствах трэба змяніць. Нейкія рэчы спрасціць, нейкія вырашыць, каб не было прававых калізій.** Мы павінны лічыцца з меркаваннем усіх. Пратэстам неабходна быць такімі, каб яны не перашкаджалі іншым. Я гатовы як дэпутат працаваць над тым, каб закон аб масавых мерапрыемствах быў больш дэмакратычным. Мы павінны разумець, што 9 жніўня мы прачнуліся ў новай палітычнай рэальнасці. Наша заканадаўства павінна зыходзіць з гэтага і адпавядаць таму, што адбываецца ў грамадстве і краіне.

— Нягледзячы на гэту новую рэальнасць, улады пакуль адмаўляюцца ад дыялогу з апазіцыяй і плануюць яго весці толькі з легітымнымі супольнасцямі. Як пратэсным арганізацыям стаць легітымнымі?

— Маё разуменне дыялогу — ён павінен быць у рамках закону. Што датычыцца рэгістрацыі новых грамадскіх арганізацый, палітычных партый, я лічу, што ўлады не павінны баяцца іх рэгістраваць. Хай іх будзе шмат, як, напрыклад, у Расіі. Там амаль 150 палітычных партый, а выбары выйграюць толькі тыя, што карыстаюцца найбольшай падтрымкай насельніцтва. Не трэба баяцца дэмакратызацыі. Неабходна разумець: арганізацыі, партыі павінны фінансавацца толькі ўнутры краіны. Тыя, што атрымліваюць сродкі па-за межамі краіны, ніколі не будуць адстойваць нашы нацыянальныя інтарэсы. Партыі, якія прайшлі парламенцкі парог, ва ўсім свеце маюць дзяржаўную фінансавую падтрымку, і мы павінны развіваць сваё легальнае палітычнае поле. Я выступаю за дэмакратызацыю рэгістрацыі грамадскіх арганізацый і палітычных партый.

— Які шлях, падсумоўваючы ўсё вышэйсказанае, вы бачыце сёння як выхад з крызісу?

— Па-першае, ніякага гвалту быць не павінна. Усё вырашаць толькі ў законным ключы. Дыялог па Канстытуцыі, па змене палітычнай сістэмы краіны — тая платформа, што можа аб'яднаць людзей. Ключавое для мяне ў Канстытуцыі — гэта змена выбарчага заканадаўства, пераход на выбары па прапарцыянальна-мажарытарнай сістэме ці поўнасцю па партыйных спісах дэпутатаў усіх узроўняў. Мы павінны ісці толькі эвалюцыйным, а не рэвалюцыйным шляхам. Задача любых выбараў — узмацніць краіну, зрабіць яе мацнейшай, але мы не сталі мацней пасля 9 жніўня. А сёння мы павінны думаць, што будзе далей.

«Я ўпэўнены, мы павінны пазбягаць гвалту, асудзіць яго, не дапускаць эскалацыі, старацца чуць адзін аднаго. Асаблівасць таксама такая, што ў нас не адбылася рэвалюцыя».

— Дык усё ж такі, на вашу думку, што далей? Ці не загразнем мы ў замкнутым крузе: пратэсты, затрыманні, суды...

— Я спадзяюся, што мы выйдзем з такога круга. Прыйдзем да цывілізаванай палітыкі, не вулічнай, а рэальнай. Для гэтага ўсім неабходна зрабіць крок наперад — уладам, тым, хто выходзіць на вуліцу, палітыкам. Мы павінны размаўляць не мовай ультыматумаў, а чуць адзін аднаго. І наша з вамі размова — таксама крок, каб выйсці з гэтай сітуацыі. Хочацца, каб Беларусь стала мацнейшай, кансалідаванейшай і спакайнейшай. Я думаю, што ў нас хопіць сіл, рэсурсаў, розуму, каб так і было.

Марыя ДАДАЛКА.

Супрацоўніцтва

ПОГЛЯД ЗВЫСОКУ

На ўзбраенне Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз паступілі 15 новых дронаў. Новая тэхніка з'явілася дзякуючы праграме трансгранічнага супрацоўніцтва Латвія — Літва — Беларусь на 2014—2020 гады. Яна рэалізуецца ў межах Еўрапейскага інструмента суседства, які фінансуецца Еўрасаюзам. Асноўная мэта праекта — забеспячэнне бяспекі ў краінах-суседзях Літве і Беларусі, павышэнне эфектыўнасці расследавання на вялікіх тэрыторыях.

— Мы пачалі рэалізацыю праекта «Новыя крыміналістычныя тэхналогіі агляду месца здарэнняў і ўмацавання грамадскай бяспекі», — расказаў **начальнік галоўнага ўпраўлення крыміналістычных экспертыз цэнтральнага апарату Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Беларусі палкоўнік юстыцыі Андрэй РАШЧУПКІН.** — Нашым партнёрам з'яўляецца Цэнтр судовай экспертызы літоўскай паліцыі.

Праект разлічаны на 21 месяц, яго бюджэт складае звыш 850 еўра. Еўрапейскі саюз фінансуе 765 тысяч еўра.

Новая тэхніка будзе выкарыстоўвацца не толькі ў сталіцы, але і ў Мінскай, Віцебскай і Гродзенскай абласцях. На дроны ўскладваецца вельмі важная місія — дапамога падчас агляду месцаў здарэнняў тэхнагеннага і прыроднага характару, дарожна-транспартных здарэнняў, пошуку людзей у лясах. Кожны беспілотнік абсталяваны фота- і відэаапаратурай, якая дазволіць якасна вызначыць карціну месца падзей. А гэта істотна дапаможа ў расследаванні крымінальных спраў.

— Абсталяванне, якое закупляецца ў Беларусі, набываецца і ў Літве. Яно будзе цалкам сумяшчальнае. Гэта дапаможа праводзіць сумесныя агляды месцаў здарэння і пры высвятленні ўсіх акалічнасцяў злачынстваў у памежных раёнах, — адзначае Андрэй Рашчупкін.

Гэта першы досвед выкарыстання беспілотнікаў судовымі экспертамі. Але і ў нашых суседзяў аналагічныя структуры зусім нядаўна прынялі іх на ўзбраенне.

Таму істотнага адставання ў гэтым плане няма.

На гэтым паляпшэнне тэхнікі не спыніцца. Неўзабаве ў спецыялістаў ДКСЭ з'явяцца 3D-сканеры і запрацуе перасоўная крыміналістычная лабараторыя, якая будзе аснашчана ўсімі неабходнымі прыстасаваннямі для працы на месцы.

Як паведамілі ў ДКСЭ, змест інфармацыі з'яўляецца выключнай адказнасцю Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз і не з'яўляецца адлюстраваннем афіцыйнай пазіцыі Еўрапейскага саюза.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

СУПРАЦЬ «ДУРМАНУ»

35-гадовы жыхар Мінска быў затрыманы інспектарамі ДАІ ў той час, калі рабіў чарговую «закладку» дурману. Пра гэта паведамляе Міністэрства ўнутраных спраў. Ведамства адзначае, што мужчына ступіў на сцежку наркабізнесу два месяцы таму, у чым ён прызнаўся сам.

Яшчэ больш наркотыкаў было канфіскавана ў іншых месцах. У аўтамабілі, якім кіравала былая жонка затрыманага, знойдзена 100 грамаў пара-метылэфедрону, які адносіцца да асабліва небяспечных псіхатропных рэчываў. Яшчэ паўсотні грамаў гэтага рэчыва было адабрана падчас агляду Першамайскага раёна і тэрыторыі Мінскага раёна, якая знаходзіцца побач з ім. Дадаткова 300 грамаў знайшлі ў кватэры, якую здымаў затрыманы.

Дзеля большай маскіроўкі пара-метылэфедрон быў расфасаваны ў поліэтыленавыя пакеты. У сваю чаргу, яны пагружаліся ў гіпсавы раствор, які надаваў пакетам форму каменя.

Паведамляецца, што затрыманы не раз прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за розныя злачынствы.

А ў Віцебску супрацоўнікі наркакантролю спынілі дзейнасць адразу дзвюх віртуальных наркакрамаў. Адну з іх арганізавалі трое маладых людзей. Старэйшаму з іх — 21 год, сярод затрыманых ёсць і 18-гадовая дзяўчына.

— Псіхатропы яны набывалі ў Расіі, пасля прывозілі іх у Віцебск, дзе і фасавалі на здымнай кватэры для далейшага продажу, — адзначылі ў прэс-службе МУС. — Там былі знойдзены прылады для фасоўкі і ўпаковачныя матэрыялы. Маладых людзей затрымалі проста падчас перавозкі чарговай партыі пара-метылэфедрону вагой каля 500 грамаў. Па інфармацыі, якая маецца, яны распаўсюджвалі наркотыкі не толькі ў Віцебску, але і ў Оршы з Наваполацкам. Зараз ужо вядома пра паўтары сотні закладак з наркотыкам.

Што да другога наркатычнага «магазіна», то яго арганізаваў 31-гадовы жыхар Віцебска. Раней ён ужо меў праблемы з законам праз незаконнае абарачэнне забароненых рэчываў. Схема крамы была такая ж, як і ў першым выпадку, — закупка аптовай партыі ў Расіі і фасоўка на дробныя з далейшай «закладкай» у абласным цэнтры. Вось падчас чарговага працэсу «закладкі» яго і затрымалі. Ператрус на кватэры і ў тайніках па ўсім Віцебску выявіў каля 850 грамаў альфа-PVP — асабліва небяспечнага рэчыва.

«Пагарэў» на гандлі дурманам і 21-гадовы гомельскі студэнт. Каля могілак у абласным цэнтры ён зрабіў некалькі «закладак» псіхатропаў, калі яго і затрымалі на месцы. Больш за тое, пры ім быў тавар, ужо «расфасаваны» ў пакеты вагой па 200 і 50 грамаў. Яшчэ 290 грамаў альфа-PVP аператыўнікі знайшлі ў пакоі інтэрната, дзе жыў студэнт. Там жа быў і ўвесь патрэбны інвентар — высокадакладныя вагі, пустыя пакецікі, скотч... Студэнт расказаў, што набываў наркотыкі ў адной з віртуальных крамаў. Часам па «тавар» даводзілася ездзіць у Мінск.

Ва ўсіх выпадках распачаты крымінальныя справы.

Сітуацыю з наркотыкамі ў краіне карэспандэнту «Звязды» пракаментаваў **начальнік Галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі МУС палкоўнік міліцыі Алег СІЛЬВЕСТРОВІЧ.**

— Сёлета аператыўная абстаноўка ў сферы паставак гашышу, марыхуаны і псіхатропаў з краін Еўрасаюза моцна змянілася. Паўплывала на гэта пандэмія COVID-19. У краінах Еўропы, ва Украіне і Расіі быў уведзены каранцін, а паездкі праз дзяржаўныя межы Беларусі амаль цалкам спыніліся. Дзякуючы эпідэміялагічнай сітуацыі не выяўлена транзітных каналаў паступлення наркотыкаў з Еўрасаюза на беларускім участку знешняй мяжы АДКБ. Таксама не было выяўлена спроб паставак наркотыкаў у напрамку ЕАЭС з тэрыторыі Польшчы, Латвіі і Літвы. Практычна ўсе спыненыя сёлета каналы пастаўкі забароненых рэчываў на ўнутраны беларускі нарказнак прыходзяцца на долю Расіі — 16 з 17 перакрытых за сем месяцаў.

У сваю чаргу, гэта паўплывала на колькасць крымінальных спраў, звязаных з незаконным абарачэннем наркотыкаў. Са студзеня да ліпеня выяўлена 1015 чалавек, датычных да злачынстваў такога роду. Сярод іх — 22 непаўналетнія. Агульная колькасць у параўнанні з такім жа перыядам мінулага года скарацілася на чвэрць. А вось крымінальных спраў стала болей — 358 супраць 269 год таму. Абмежаваны доступ да 337 сайтаў, праз якія рэалізоўваўся «дурман».

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Актуальна

Незарэгістраваныя фонды: страчаныя грошы ці штраф за дзейнасць?

Дзейнасць фондаў, што займаюцца зборам грошай у падтрымку асоб, якія ўдзельнічаюць у несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах і іншых публічных акцыях у Беларусі, з'яўляецца незаконнай, сцвярджаюць у Міністэрстве юстыцыі.

Сваё меркаванне ведамства тлумачыць тым, што фонды, якія займаюцца зборам грошай на ўказаныя мэты, у краіне не зарэгістраваны. Між тым, каб палітычная партыя, грамадскае аб'яднанне або фонд маглі ажыццяўляць законную дзейнасць, яны павінны прайсці дзяржрэгістрацыю ў органах юстыцыі. Парадак і ўмовы дзейнасці фондаў рэгулюецца Указам Прэзідэнта ад 1 ліпеня 2005 года № 302 «Аб некаторых мерах па ўпарадкаванні дзейнасці фондаў», Грамадзянскім кодэксам і іншым заканадаўствам Беларусі.

Арганізацыя дзейнасці або ўдзел у рабоце фонду, які не прайшоў ва ўстаноўленым парадку дзяржрэгістрацыю, лічыцца незаконнай і з'яўляецца адміністрацыйным правапарушэннем, што мае вынікам штраф адпаведна з артыкулам 23.88 Кодэкса Беларусі аб адміністрацыйных правапарушэннях, адзначыў **Аляксей ПЕЧКУРОЎ, намеснік начальніка ўпраўлення па пытаннях некамерцыйных арганізацый Міністэрства юстыцыі Беларусі:**

— Сёння ў краіне зарэгістравана 15 палітычных партый, 3025 грамадскіх аб'яднанняў і 224 фонды. Толькі за год у краіне з'явілася больш за паўсотні грамадскіх аб'яднанняў і каля дзесяці фондаў. Зарэгістраваныя ў Беларусі фонды ставяць сабе сацыяльныя, дабрачынныя, культурныя, адукацыйныя мэты, садзейнічаюць развіццю фізкультуры і спорту. Работа некаторых фондаў скіравана на дасягненне навуковых ці іншых грамадска карысных мэт. Заканадаўча зроблена ўсё, каб абсалютная большасць арганізацый, якія звяртаюцца ў рэгіструючыя органы, паспяхова праходзілі працэдуру дзяржрэгістрацыі.

Ва ўмовах грамадска-палітычнага становішча, якое склалася ў краіне апошнім часам, выпадкі размяшчэння інфармацыі пра з'яўленне фондаў, што збіраюць грошы, значна пачасціліся, як і пытанні грамадзян, наколькі можна давяраць такім арганізацыям.

— Дзейнасць падобных псеўдафондаў знаходзіцца па-за межамі прававога поля, — падкрэсліў прадстаўнік Мінюста. — У сувязі з гэтым адсутнічаюць дзейсныя механізмы празрыстасці і кантролю рухаў грашовых сродкаў, якія накіроўваюцца ў распараджэнне «фондаў». Гэта можа прыводзіць таксама да неправамернага ўзбагачэння людзей, якія маюць непасрэднае дачыненне да збору і размеркавання гэтых сродкаў.

Міністэрства юстыцыі лічыць малаверагодным усплёск стварэння новых палітычных партый у краіне як вынік хвалявання, што адбываюцца цяпер у Беларусі, чым таксама цікавяцца беларусы, як сведчыць Аляксей Печкуроў:

— Павелічэнне колькасці дакументаў, якія падаюцца для дзяржрэгістрацыі палітычных партый, адбываецца, як правіла, перад выбарчымі кампаніямі ў прадстаўнічыя органы нашай дзяржавы. Гэта абумоўлена тым, што партыі маюць права вылучэння кандыдатаў у дэпутаты ў мясцовыя Саветы дэпутатаў і Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. Аднак партыі не маюць права вылучаць кандыдатаў у прэзідэнты, таму звычайна ўзмацненне актыўнасці дзейнасці партый перад выбарамі прэзідэнта не назіраецца.

Ірына СІДАРОК.

Ваша права

КАБ УДАСКАНАЛІЦЬ КРЫМІНАЛЬНУЮ АДКАЗНАСЦЬ

Мяркуецца распрацаваць законапраект аб змяненнях у адпаведных кодэксах Беларусі: Крымінальным, Крымінальна-працэсуальным і Крымінальна-выканаўчым. Прапановы грамадзян па паляпшэнні дзеяння абазначаных дакументаў чакаюць на прававым форуме краіны forumpravo.by да 5 кастрычніка.

Прааналізаваныя матэрыялы будуць выкарыстаны пры падрыхтоўцы праектаў кодэксаў аб крымінальнай адказнасці. Кардынаваць работу міжведамаснай рабочай групы будзе Міністэрства юстыцыі.

— Чакаецца маштабная работа па пераглядзе асноўных палажэнняў Крымінальнага, Крымінальна-працэсуальнага і Крымінальна-выканаўчага кодэксаў. Пакуль ажыццяўляецца збор, вывучэнне і абагульненне прапаноў па ўдасканаленні абазначаных дакументаў, — расказала **Святлана РОГАВА, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення нарматворчай дзейнасці ў сферы дзяржаўнага будаўніцтва Міністэрства юстыцыі Беларусі.** *— Мы чакаем ідэй таксама і ад грамадзян, таму на сайце forumpravo.by, Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале, на веб-партале Мінюста размешчана інфармацыя аб зборы прапаноў ад усіх зацікаўленых.*

На форумах ужо з'явілася некалькі прапаноў, якія, мяркуючы па змесце, выкліканы жыццёвай практыкай. Раяць, напрыклад, поўнасцю пазбавіцца ад інстытута панятых, бо *«іх можна падабраць з ліку «сваіх» і яны не гарантуюць абароны ад фальсіфікацый, аднак ствараюць праблемы для следства»*.

Абазначылі і вострую праблему даўжнікоў, пра акалічнасці якой неаднаразова казалі юрысты. На форуме прапануюць узмацніць меры адказнасці даўжнікоў, ажно да абавязковага прымусовага працаўладкавання і крымінальнай адказнасці за нявыплаты. Такое стаўленне зразумела, бо часта *«даўжнікі шчыра падпісваюць міравое пагадненне, даюць распіскі, засведчаныя натарыусам, а самі перапісваюць маёмасць на сваякоў, і ўзяць з іх няма чаго»*.

Выказалі меркаванне і адносна датэрміновага вызвалення, прапануючы агучваць права на яго падчас вынясення прысуду. Згодна з цяперашнім законам, *«права на датэрміновае вызваленне ад пакарання (ці замену яго больш мяккім) практычна цалкам залежыць ад адміністрацый калоній, а не суда, які прымае адпаведнае рашэнне фармальна»*, мяркуюць на форуме.

У Міністэрстве юстыцыі разумеюць шматзадачнасць і адказнасць работы, што мае адбыцца, таму падкрэсліваюць важнасць канструктыўнага і эфектыўнага ўзаемадзеяння ўсіх зацікаўленых для дасягнення пастаўленых мэт па ўдасканаленні кодэксаў.

— Канчатковымі рэдакцыямі праектаў аб крымінальнай адказнасці, іх узгадненнем з усімі зацікаўленымі суб'ектамі і публічным абмеркаваннем будзе займацца Міністэрства юстыцыі, — дадала спецыяліст.

Ірына СІДАРОК.

ДЗЕЦЯМ НЕ МЕСЦА НА МІТЫНГАХ

Міністэрства адукацыі занепакоена сітуацыяй, калі бацькі ўцягваюць дзяцей у масавыя мерапрыемствы палітычнага характару

— Важна, каб дарослыя разумелі, хто выступае ў якасці прыкладу для дзіцяці і ўзор якіх паводзін яму дэманструецца, — заявіла **намеснік начальніка ўпраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Алена ГАЛАЎНЁВА.** — Перш за ўсё яны павінны памятаць, што нясуць адказнасць за бяспеку сваіх дзяцей. Калі бацькі з каляскай, з маленькімі дзецьмі выходзяць на якія-небудзь несанкцыянаваныя вулічныя шэсці, то ставяць жыццё дзяцей пад пагрозу.

Алена Галаўнёва лічыць, што дарослыя не павінны ўцягваць дзяцей у свае палітычныя гульні. Ім трэба даць права праводзіць час з равеснікамі, наведваць школы, кружкі і секцыі.

Нагадаем, што падчас несанкцыянаванага масавага мерапрыемства ў нядзелю на праспекце Пераможцаў у Мінску супрацоўнікі міліцыі затрымалі 12-гадовага падлетка, які наносіў фарбай пратэсныя надпісы на асфальце. Хлопчыка ў хуткім часе перадалі бацькам. Інспектарамі па справах непаўналетніх праводзіцца праверка.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Извещение о проведении повторных* торгов в форме открытого аукциона ЗАО «ТК Банк»

ЗАО «ТК Банк» проводит повторные торги в форме открытого аукциона по продаже следующего имущества:

Номер лота	Наименование	Адрес	Площадь, м²	Дата ввода в эксплуатацию	Начальная цена предмета торгов с учетом НДС, евро	Размер задатка, евро	Сумма шага аукциона, евро
1	Изолированное помещение с инвентарным номером 100/D-125545	г. Брест, ул. Советская, 34-1	11 957,1	20.08.2013	8 440 981,51	422 049,08	422 049,08

Торги состоятся 29 сентября 2020 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева, 65а.

Участие в торгах оформляется заявкой на участие в аукционе.

Заявки принимаются с 9.00 18 сентября 2020 года до 17.00 28 сентября 2020 года.

Для участия в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и представившие следующие документы:

- письменную заявку на участие в торгах;
- подписку о том, что у них нет препятствий, предусмотренных законодательством, для приобретения имущества.

Сумма задатка в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату платежа должна быть внесена на текущий (расчетный) банковский счет продавца не позднее 28 сентября 2020 года. Получатель платежа: ЗАО «ТК Банк», УНП 807000163, р/с BY28BBTK66700027600000000933, БИК BBTKBY2X. Назначение платежа: задаток за участие в аукционе.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. В случае признания торгов несостоявшимися по причине подачи заявления только одним участником предмет аукциона может быть продан этому участнику с его согласия с увеличением начальной цены аукциона на 5 процентов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения в любое время, но не позднее чем за 3 (три) рабочих дня до наступления даты его проведения.

Результаты торгов оформляются протоколом торгов, который подписывается победителем аукциона (покупателем – единственным участником) в день проведения торгов. Победитель аукциона обязан заключить договор купли-продажи с продавцом в течение 5 (пяти) рабочих дней с даты проведения аукциона. Срок оплаты – после государственной регистрации договора купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата производится в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату платежа. Переход права собственности на приобретаемое имущество происходит после полной оплаты его стоимости. Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, а также государственной регистрацией договора купли-продажи и перехода права собственности, несет покупатель.

Ознакомиться с предметом аукциона можно, связавшись с продавцом по тел. (+375 17) 270-80-00 (Мальков Сергей Владимирович, Янушкевич Сергей Анатольевич) или на сайте **https://tcbank.by/about/selling/**. Продавцом и организатором торгов выступает ЗАО «ТК Банк», г. Минск, ул. Тимирязева, 65а.

** – Извещение о проведении торгов было опубликовано в газете «Звязда» от 04.08.2020.*

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5**
Продавец	**ОАО «Управляющая компания холдинга «Бобруйскагромаш», Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Шинная, 5**
Оператор ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б**
Адрес ЭТП	**www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов

Наименование (составные части и принадлежности)	Общая площадь, кв. м	Инвентар. номер
Лот № 1 **Месторасположение: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Шинная, д. 13**		
Производственный корпус ГСПКТБ № 1	2980,4	710/С-13026
Здание склада нефтепродуктов (составные части и принадлежности: пристройка)	86	710/С-13003
Здание автомобильных весов	29	710/С-13004
Площадки и проезды (составные части и принадлежности: площадки бетонные (литер а1, а2, а3, а4, а5), дорожка (литер а8), асфальтобетонные площадка (литер а6) и проезд(литер а7)	6580	710/С-74589
Ограждение территории (составные части и принадлежности: ограждения наружное металлическое корпуса (литер а1), внутренней территории (литер а2, из металлической сетки – литер а3), площадки для мусора (деревянное) (литер а4), ограждение (контейнер с отходами) (литер а5)	350,45 м	710/С-80801
В состав лота входит оборудование – система пожаротушения (инв. № 00826)		
Сведения о земельном участке: пл. **1,4348 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания зданий и сооружений производственного назначения. Ограничения (обременения) прав: сервитут		
Обременения: на территории лота № 1 расположено защитное сооружение гражданской обороны, которое не входит в состав лота. После продажи земельный участок будет разделен в долях с установлением сервитута		
Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 918 295,70 бел. руб. (снижена на 30 %)		
Лот № 2 **Месторасположение: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Шинная, д. 13г, 13д**		
Арочный склад (здание нежилое)	214	710/С-4816
Площадка (сооружение неустановленного назначения)	454	710/С-74587
Склад (здание нежилое)	9	710/С-4817
Площадка	21	710/С-74595
Ограждение наружное металлическое корпуса (составные части и принадлежности: ограждения металлическое (литер а1) и из металлической сетки (литер а2)	40,96 м	710/С-80802
Сведения о земельных участках: 1) пл. **0,1170 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания здания арочного склада; 2) пл. **0,0061 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания зданий и сооружений производственного назначения (земельный участок № 2)		
Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 49 159,87 бел. руб. (снижена на 30 %)		
Лот № 3 **Месторасположение: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Шинная, д. 13**		
Здание инженерного корпуса (здание многофункциональное) (составные части и принадлежности: автостоянка личного автотранспорта, лифты)	4561,3	710/С-2146
Площадки и проезды (составные части и принадлежности: проезд (литер а1), площадка (литер а2)	510	710/С-80804
Внутриплощадочные сети хозфекальной канализации (сооружение специализированное водохозяйственного назначения) (составные части и принадлежности: трубопровод – 5 шт., колодец – 3 шт.)	667,6	710/С-80813
Сети водоснабжения (сооружение специализированное водохозяйственного назначения) (составные части и принадлежности: трубопровод – 2 шт., трубопроводная арматура – 9 шт., колодец – 7 шт.)	445,1	710/С-80814
В состав лота входит оборудование – теплообменник (инв. № 70156), теплообменник ПВВ-07*114*2000 (инв. № 70154), теплосчетчик ТЭРМ-02-6 (инв. № А4006), регулятор температуры (инв. № 70157), электрические сети и учет (инв. № 70180)		
Обременения: площади здания частично сданы в аренду, в т. ч. договор безвозмездного пользования с УЗ «Бобруйская городская больница скорой медицинской помощи». Здание инженерного корпуса находится в залоге у ОАО «Белагропромбанк». Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона		
Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 1 472 064,79 бел. руб. (снижена на 30 %)		
Лот № 4 **Месторасположение: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Шинная, д. 13**		
Здание столовой с конференц-залом (здание нежилое)	1934	710/С-5685
Площадки и проезды (составные части и принадлежности: площадки (литер а1, а2, а3), дорожки (литер а4, а5), клумба (литер а6), ограждение (литер а7)	466	710/С-80806
В состав лота входит оборудование – холодильный агрегат АРТХ-5 (инв. № 44047), КТП-28 (инв. № 09224)		
Обременения: здание столовой и конференцзала находится в залоге у ОАО «Белагропромбанк». Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона		
Начальная цена лота № 4 с НДС 20 % – 609 436,80 бел. руб. (снижена на 20 %)		
Сведения о земельном участке по лотам № 3 и № 4: пл. **1,0839 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания зданий и сооружений производственного назначения. Ограничения (обременения) прав: после продажи земельный участок будет разделен в долях с установлением сервитута		
Лот № 5 **Месторасположение: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Шинная, д. 13**		
Площадка	428	710/С-74591
Ограждение наружное металлическое корпуса (составные части и принадлежности: ворота, калитка)	21,97 м	710/С-80803
Сведения о земельном участке: пл. **0,0622 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания зданий и сооружений производственного назначения		
Начальная цена лота № 5 с НДС 20 % – 27 072,96 бел. руб. (снижена на 30 %)		
Задаток по лотам № 1 и № 3 – 1 %, по лотам № 2, № 4, № 5 – 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»		
Срок подписания договора купли-продажи: 30 (тридцать) рабочих дней после проведения аукциона		
Условия оплаты предмета электронных торгов		
Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи		
Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by		
Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов		
Извещение о проведении предыдущих электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 16.07.2020		
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона		
Дата и время начала и окончания электронных торгов	**Начало торгов: 11.00 30.09.2020. Окончание торгов: 12.00 30.09.2020.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов	
Дата и время окончания приема заявок	**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 28.09.2020 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**	
Контактные телефоны	**+375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**	

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**Унитарное предприятие «Слуцкий рынок ОПС», г. Слуцк, пл. Базарная, 13**

Предмет аукциона

Лот №	Наименование
1	**Здание магазина (здание специализированной розничной торговли)** (инв. номер 640/С-100264) общей площадью 106,8 кв. м по адресу: Минская обл., Слуцкий район, Первомайский с/с, д. Кальчицы, ул. Новины, 5А. Земельный участок общей площадью 0,1048 га предоставлен на праве аренды по 27.02.2039 г. для обслуживания здания магазина
Начальная цена лота с НДС 20 % – 12 720,00 белорусских рублей	
2	**Здание магазина (здание специализированной розничной торговли)** (инв. номер 640/С-74836) общей площадью 98,04 кв. м по адресу: Минская область, Слуцкий район, Сорогский с/с, д. Хорошево, 3. Составные части и принадлежности: сарай (2 шт.), уборная. Земельный участок общей площадью 0,0668 га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания и эксплуатации магазина
Начальная цена лота с НДС 20 % – 11 640,00 белорусских рублей	
3	**Здание магазина № 26 (здание специализированной розничной торговли)** (инв. номер 640/С-26618) общей площадью 55,0 кв. м по адресу: Минская обл., Слуцкий район, Сорогский с/с, д. Волошево, магазин № 126. Составные части и принадлежности: склад, сарай (2 шт.). Земельный участок общей площадью 0,0422 га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания и эксплуатации строений и сооружений
Начальная цена лота с НДС 20 % – 6 120,00 белорусских рублей	
Дата и время проведения аукциона по лотам №№ 1–3: 19.10.2020 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. Срок подачи документов: по 16.10.2020 г. до 17.00 по указанному адресу	
4	**Здание склада** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально – технического снабжения, хранилищ) (инв. номер 640/С-84559) общей площадью 286 кв. м по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Максима Богдановича, 136А/2. **Здание кирпичное (здание неустановленного назначения)** (инв. номер 640/С-84557) общей площадью 40,4 кв. м по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Максима Богдановича, 136А/1. Земельный участок общей площадью 0,1009 га предоставлен на праве аренды по 10.01.2033 г. для содержания и обслуживания зданий
Начальная цена лота с НДС 20 % – 36 416,00 белорусских рублей	
Дата и время проведения аукциона по лоту № 4: 02.10.2020 г. 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. Срок подачи документов: по 01.10.2020 г. до 17.00 по указанному адресу	
Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона	
Условия оплаты для лотов №№ 1–3: если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи	
Условия оплаты для лота № 4: 50 % от цены продажи имущества с учетом ранее внесенной суммы задатка оплачивается в течение 5 (пяти) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи, оставшаяся сумма оплачивается с рассрочкой платежа на срок до 6 (шести) месяцев	
Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»	
Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**	
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия	
Предыдущее извещение о проведении аукциона по лоту № 4 в газете «Звязда» от 03.03.2020 г.	
Контактные телефоны	**+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

УНН 190431606

УП «Белконфискат»
объявляет о проведении электронных торгов 02.10.2020 г. по продаже имущества Миткевич Ф. П.
легковой седан «Сузуки Балено», 1996 г. в., начальной стоимостью 1 200 рублей.

На сайте belkonfiskat.by размещена информация о торгах.
Справки по тел.: 8 (017) 3639489, 8 (029) 7790809.

ОАО «Элегант» извещает о внесении изменений в повестку дня собрания акционеров 28 сентября 2020 года:

ПОВЕСТКА ДНЯ

1. О совершении сделок.
2. О решении единственного участника.

УНН 400078331 Наблюдательный совет.

22.09.2020 г. в 14.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Гомельжилпроект».

Повестка дня

1. Об изменении размера уставного фонда общества.
2. О внесении и утверждении изменений в устав ОАО «Гомельжилпроект».

Местонахождение ОАО «Гомельжилпроект»: г. Гомель, ул. Кирова, 17.

Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Кирова, 17.

Время регистрации в день проведения собрания с 13.30 до 14.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 17.09.2020 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

Дата сбора реестра акционеров – 17.09.2020 г.

УНП 400022625 Наблюдательный совет.

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Наталля Міцькоўская ўзначаліла РНПЦ «Кардыялогія»

Дырэктарам РНПЦ «Кардыялогія» стала старшыня Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства кардыёлагаў і тэрапеўтаў», доктар медыцынскіх навук, прафесар Наталля Міцькоўская.

Да свайго прызначэння на пасаду Наталля Паўлаўна ўзначальвала кафедру кардыялогіі і ўнутраных хвароб Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта. Яе навуковыя працы як фундаментальнага, так і прыкладнога характару прысвечаны вывучэнню прычын і механізмаў развіцця вострай і хранічнай каронарнай паталогіі, распрацоўцы метадаў ацэнкі і карэкцыі кардыяваскулярнай рызыкі ў асоб з камарбіднай паталогіяй, у пацыентаў пасля трансплантацыі печані, нырак, лёгкіх, распрацоўцы і ўкараненню тэхналогіі верыфікацыі і аптымізацыі лячэння спалучэння хранічнага і вострага паражэння каронарнага і цэрэбральнага сасудзістых басейнаў, абгрунтаванню і аптымізацыі прымянення інтэрвенцыйнай і экстракарпаральнай тэхналогій.

Стаж работы па спецыяльнасці — 37 гадоў, у Беларускім дзяржаўным медыцынскім універсітэце — 27 гадоў, на пасадзе загадчыка 3-й кафедры ўнутраных хвароб — 7 гадоў, кафедры кардыялогіі і ўнутраных хвароб — 5 гадоў.

Наталля Міцькоўская скончыла Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут у 1983 годзе. У 1992-м абараніла дысертацыю на саісканне вучонай ступені кандыдата медыцынскіх навук, у 2004-м абараніла доктарскую дысертацыю і ёй была прысуджана вучоная ступень, у 2007-м прысвоена вучонае званне прафесара.

Яна ўрач вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі па тэрапіі, вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі па кардыялогіі, валодае метадамі аказання неадкладнай дапамогі пацыентам кардыялагічнага і тэрапеўтычнага профілю, неінвазіўнай функцыянальнай дыягностыкі ў кардыялогіі, метадалогіяй экстракарпаральнай дэтаксікацыі арганізма.

Практыцы трансплантацыі ныркі ў Беларусі — паўстагоддзя!

У гэтыя дні транспланталогія нашай краіны адзначае важную дату — 50 гадоў з дня першай трансплантацыі ныркі. У Беларусі першая перасадка гэтага органа была выканана 11 верасня 1970 года акадэмікам М. Я. Саўчанкам на базе клінікі ўралогіі МДМІ ў 4-й бальніцы Мінска.

Падзея стала важным штуршком да развіцця медыцыны нашай краіны, паколькі ў іншых рэспубліках СССР і нават у свеце трансплантацыі ныркі пачалі выконваць некалькі пазней. Ва Украіне першую паспяховую трансплантацыю ў клінічных умовах ажыццявілі ў Кіеве ў 1972 годзе, а ў Оксфардзе (Вялікабрытанія) прафесар Пітэр Морысан перасадзіў нырку ў 1974 годзе.

У 2006 годзе ў Беларусі выконвалася ўсяго толькі восем аперацый па перасадцы ныркі. А з 2011 года толькі ў Мінскім НПЦ хірургіі,транспланталогіі і гематалогіі было праведзена больш за 1620 перасадак.

Сёння перасадка нырак з'яўляецца найбольш распаўсюджаным відам трансплантацыі. Беларусь за 15 гадоў змагла ўвайсці ў топ-20 найбольш развітых трансплантацыйных краін свету. Толькі летась зроблена 528 розных трансплантацый. Беларускія трансплантолагі асвоілі ўсе аперацыі, якія існуюць у свеце, і зрабілі так, што людзі, у якіх яны вучыліся, цяпер накіроўваюць сваіх вучняў у Беларусь на навучанне.

Цяпер па ўзроўні развіцця донарства і трансплантацыі наша краіна займае 9-е месца ў свеце. Пры гэтым мы не толькі знаходзімся на перадавых пазіцыях на працягу пэўнага перыяду часу, але і будуем планы на будучыню, узводзяцца новыя цэнтры, абсталёўваюцца самым сучасным абсталяваннем, а ўрачы працягваюць змагацца за кожнага пацыента.

Расці вялікая, Аліса!

Аперацыя на сэрцы 930-грамовай малой доўжылася паўтары гадзіны

Унікальную аперацыю правялі беларускія дзіцячыя кардыяхірургі Дзіцячага хірургічнага цэнтра, пра што паведаміла прэс-служба Міністэрства аховы здароўя.

У РНПЦ «Маці і дзіця» нарадзілася маленькая Аліса. На момант нараджэння дзяўчынка важыла ўсяго 930 грамаў. У выхадныя было прынята рашэнне аб пераводзе яе ў Дзіцячы хірургічны цэнтр для правядзення аперацыі.

Як расказаў урач-кардыяхірург, загадчык аддзела дзіцячай кардыяхірургіі і ДХЦ Юрый Ліннік, у дзяўчынкі быў дыягнаставаны прыроджаны парок сэрца. Безумоўна, гэта дастатковa распаўсюджаная паталогія пры такой крытычнай масе цела. Аднак урачы выявілі ў малой падазрэнне на фарміраванне каарктацыі (звужэння) аорты. У выніку было прынята рашэнне аб правядзенні тэрміновага хірургічнага ўмяшання.

Аперацыя выконвалася праз невялікі разрэз на спіне, без штучнага кровазвароту і доўжылася паўтары гадзіны.

Маніторынг працягваецца

НЕ ТАЯ ТЭХНАЛОГІЯ ПРЫГАТАВАННЯ І ТЭМПЕРАТУРА ПАДАЧЫ

Амаль трэць школьных кафэ і сталовых парушаюць санітарна-эпідэміялагічныя патрабаванні

Штогод, у пачатку навучальнага года, санітарна-эпідэміялагічная служба праводзіць маніторынг выканання санітарна-эпідэміялагічных патрабаванняў пры арганізацыі харчавання школьнікаў. Падводзячы папярэднія вынікі работы службы, варта адзначыць, што сёлета ўжо праверана трэць устаноў агульнай сярэдняй адукацыі краіны. Гаворка ідзе пра школьныя аб'екты харчавання — кафэ і сталовыя. На жаль, у 27 % з іх колькасці выяўлены парушэнні, паведамляе прэс-служба Міністэрства аховы здароўя.

Сярод асноўных праблем, зафіксаваных спецыялістамі санітарна-эпідэміялагічнай службы, парушэнні ў тэхналогіі прыгатавання страў, парушэнні патрабаванняў па выкананні тэмпературы падачы страў, а таксама тое, што не функцыянуюць Саветы па харчаванні; бракеражныя камісіі працуюць фармальна; не ажыццяўляецца кантроль за выкананнем асабістай гігіены навучэнцамі; парушаецца рэжым прыборкі памяшканняў аб'ектаў харчавання.

Па ўсіх парушэннях санітарна-эпідэміялагічная служба прыняла меры ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Адзначым, што сёлета маніторынг будзе працягнуты да канца верасня, а наглядныя мерапрыемствы за арганізацыяй харчавання будуць ажыццяўляцца на працягу ўсяго навучальнага года.

Спосаб жыцця

ЧАМУ ВАГА НЕ ЗНІЖАЕЦЦА?

Урач пра распаўсюджаныя памылкі пры пахудзенні

Распаўсюджанай памылкай тых, хто худзее, з'яўляецца выкарыстанне складаных і цяжкіх дыет. На самай справе карэктаваць вагу лепш з дапамогай адпаведнага рэжыму харчавання, які ў далейшым здольны перайсці ў спосаб жыцця. Пра памылкі тых, хто марыць пазбавіцца ад пары-тройкі ці нават пары дзясяткаў кілаграмаў, асаблівасці дыет і важнасць правільнага рацыёну пры пахудзенні нам расказаў урач-гігіеніст Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Юрый ГУЗІК.

Рэзкае зніжэнне энергетычнай каштоўнасці рацыёну — першая і найбольш частая памылка тых, хто сабраўся пазбавіцца ад залішняй вагі. Вынікам хутчэй будзе не страта кілаграмаў, а іх павелічэнне.

Многія сутыкаліся і з такой праблемай: у рацыёне няма тлустага, мучнога, смажанага, газіроўкі і іншых шкодных прадуктаў, а вага стаіць на месцы! Часта на гэтым этапе сыходзіць і жаданне пахудзець, бо адсутнічае вынік.

— Такі чалавек ужывае садавіну ўвечары, а з раніцы есць шмат салодкага («бо раніцай можна»), ці наадварот, у яго няма сняданку («бо мне не хочацца»), а на абед толькі курыная катлетка і адзін памідор, вячэра адсутнічае («бо пасля 18.00 есці нельга»). Ёсць і яшчэ адна крайнасць: людзі не толькі адмаўляюць сабе ў сняданку, але і не абедаюць, і не вячэраюць. Але... На змену паўнавартаснаму харчаванню прыходзяць незлічоныя перакусы, бясшкодныя на першы погляд. На самай справе, калі падлічыць «з'едзеныя» падчас перакусаў калорыі, то яны прыраўноўваюцца да паўнавартаснага абеду ці вячэры. А адсутнасць вячэры можа прывесці да парушэння абмену рэчываў, — папярэджвае Юрый Гузік.

Пры гэтым трэба памятаць, што чалавечы арганізм адаптуецца да любых змен. У прыватнасці, калі недаядаць сістэматычна, як гэта робяць многія, хто сядзяць на дыетах, вага будзе сыходзіць. Але як толькі на змену дэфіцыту калорый прыйдзе іх звычайная колькасць або лішак, вага вернецца назад.

— Каб пахудзець, суадносіны асноўных нутрыентаў (пажыўных рэчываў) павінны быць наступныя: 50/30/20 (вугляводы / бялковыя злучэнні / тлушчы). Калі з'явіцца дэфіцыт любога з іх, арганізм пачне запасацца тлушчам. Для яго важныя ўсе пажыўныя элементы, і адмаўляцца ад іх нельга, — нагадвае ўрач.

Многія падчас пахудзення імкнуцца з дапамогай сокаў і садавіны разнастаіць свой рацыён. Існуюць нават адмысловыя фруктовыя дыеты. Але ці карысная такая колькасць соку і фруктаў і ці ўпісваецца гэта ў рамкі дыеты?

— Садавіна ўтрымлівае фруктозу. Арганізм ператварае яе ў цукар і адкладае пра запас. Некаторую небяспеку ўяўляюць фрукты, якія маюць высокі глікемічны індэкс. Напрыклад, вінаград і бананы. Не варта злоўжываць і грушамі з персікамі. Сцвярджэнне, быццам бы садавіну можна есці ў любой колькасці, не адпавядае рэальнасці! Гэта датычыцца і фруктовых сокаў, у якіх змяшчаецца цукар. Здаволіць голад або смагу сокамі цяжкавата, а вось падняць узровень цукру ў крыві і атрымаць дадатковыя калорыі — гэта проста, — тлумачыць суразмоўнік.

Усім, хто мае намер пазбавіцца ад тлушчу, неабходна ўвесці ў рацыён клятчатку. Гэта абавязковая ўмова для прадстаўнікоў абодвух палоў. Раслінныя валокны спрыяюць паскарэнню абменных працэсаў, дзякуючы ім павышаецца перыстальтыка кішэчніка. Пры гэтым яны валодаюць нізкай энергетычнай каштоўнасцю. Асноўнымі крыніцамі раслінных валокнаў з'яўляюцца гародніна (пераважна валакністыя, садавіна, а таксама вотруб'е).

Акрамя «правільнай» ежы ў «правільны» час, пры пахудзенні важная вада.

— Для таго каб пахудзець, арганізму неабходна шмат вадкасці. Многія памыляюцца, думаючы, што абмежаваўшы колькасць вады, яны хутчэй скінуць вагу. На жаль, гэта самападман: арганізм страціць воду, але не лішні тлушч, — адзначае ўрач. — У дзень трэба выпіваць каля двух літраў вады. Яна спрыяе паляпшэнню метабалічных працэсаў арганізма. Паскараецца абмен рэчываў, тлушчы хутчэй расшчапляюцца і выводзяцца з арганізма. Рэгулярнае ўжыванне 7-8 шклянак вады ў дзень значна зніжае апетыт.

Важна і цалкам адмовіцца ад любога алкаголю. Спіртныя напоі ўтрымліваюць шмат калорый і галоўнае — паляпшаюць апетыт. Рацыён, які вы «разнастаілі» нават бакалам віна, прывядзе да дадатковага набору вагі. Не спяшайцеся падчас яды і не бярыце пад увагу іншыя справы. Няспешная трапеза спрыяе найлепшаму засваенню ежы і найхутчэйшаму насычэнню, што немалаважна пры пахудзенні.

Пазбягайце стрэсавых сітуацый. Эмацыянальнае напружанне «матывуе» многіх на лішнія перакусы.

Ну і яшчэ адна важная рэч — кожнаму з нас неабходная пасільная фізічная нагрузка. Гэта могуць быць заняткі фізкультурай або проста хада пешшу. Рух не толькі дапаможа пазбавіцца ад кілаграмаў, але і палепшыць знешні выгляд. Прагулкі і заняткі спортам таксама спрыяюць зніжэнню эмацыянальнай нагрузкі. І не забывайце, што ва ўсіх гэтых пачынаннях павінна прысутнічаць разумная ўмеранасць і здаровы сэнс.

РАТАЎНІКІ ШУКАЮЦЬ «РАБІНЗОНАЎ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У Маладзечне працуе спецыяльны пажарны аварыйна-выратавальны атрад. На яго базе арганізавана пазаштатнае пошукава-выратавальнае аддзяленне. Яго мэта — шукаць у лясах Мінскай вобласці менавіта такіх міжвольных «рабінзонаў». Таму карэспандэнты «Звязды» адправіліся, каб сваімі вачамі паназіраць за тым, як жа ратаўнікі прачэсваюць лес, каб вывесці з яго нетраў чалавека.

— Неяк так склалася, што часцей за ўсё мы ездзім у пяць раёнаў, — заўважае **начальнік пажарна-выратавальнай службы атрада Станіслаў ТРАЦЮК.** — Гэта Салігорскі, Мядзельскі, Вілейскі, Барысаўскі і Бярэзінскі. У гэтых раёнах бадай што самыя вялікія лясы вобласці, якія прыцягваюць да сябе грыбнікоў і ягаднікаў. Але, па нашых назіраннях, часцей за ўсё ў лясах губляюцца людзі пенсійнага ўзросту. У іх натуральным чынам узнікаюць праблемы са здароўем, ужо не такая хвацкая памяць. Нярэдка і ўвогуле забываюць, куды яны ідуць. Пасля ці яны самі, ці іх родныя ўсведамляюць, што сам чалавек выйсці з лесу не можа. І на дапамогу прыходзім мы.

Ратаўнікі падлічылі — у асноўным члены сям'і зніклага пачынаюць біць трывогу на наступны дзень. Рэдка бывае так, што чалавека пачынаюць шукаць праз пару гадзін пасля таго, як ён мусіў быў вярнуцца назад, але так і не прыйшоў. Спярша яны спрабуюць адшукаць небараку самастойна. А час ідзе.

— Любы пошук пачынаецца са збору інфармацыі. Мы мусім ведаць, дзе і калі чалавек зайшоў у лес, як ён выглядае, ці прымае ён пастаянна медыкаменты, ці ёсць у яго нейкія ўлюбёныя месцы, — адзначае Станіслаў Трацюк. — Вядома, што грыбнікі рэдка дзеляцца інфармацыяй пра тое, дзе яны «вядуць распрацоўкі». Але хоць бы родныя і блізкія мусяць пра гэтыя дзялянкі ведаць. Да таго ж чым пазней нам паведамяць пра зніклага чалавека, тым даўжэйшым можа быць час яго пошукаў, паколькі трэба будзе прачасаць вялікую тэрыторыю. А вось па мабільніку трымаць сувязь удаецца нячаста. Па-першае, у лесе сігнал вельмі дрэнны, і праз гэта акумулятар у тэлефоне разраджаецца куды хутчэй. А па-другое, спрыяе гэтаму і тое, што родныя і блізкія, перш чым патэлефанаваць нам, спрабуюць трымаць кантакт са зніклым.

Таму мы просім усіх — зарадзіце перад выхадам у лес мабільны тэлефон, а калі ён падтрымлівае магчымасць заряджання ад знешняга акумулятара — гэта яшчэ лепш.

У якім жа стане знаходзяцца людзі падчас некалькіх дзён блукання ў лесе? Супрацоўнікі атрада прыгадваюць, што не раз яны выходзілі на зніклых, якія дайшлі да дарогі і знясілелі так, што больш ісці не маглі. Нярэдкія і сітуацыі, калі чалавек ідзе ўздоўж дарогі, па якой едзе аўтамабіль МНС. Але...

...пакуль ён пачне тармазіць, пакуль выскоча, пакуль агледзіцца, той ужо за дзесяць кіламетраў. Ці ён не чуе, ці не хоча спыніцца, ці не ведае, што ратаўнікі яго шукаюць. Ці ён не ведае, што пажарны аўтамабіль, які будзе падаваць сірэну. Па сцежках мы перасоўваемся на квадрацыкле. Па дарогах агульнага карыстання на ім ездзіць забаронена, а вось на лясных дарожках гэта незаменны памочнік. Актыўна выкарыстоўваем і квадракоптары. Праўда, часам з беспілотніка не разгледзець, што менавіта адбываецца ўнізе.

Аляксандр Канкаловіч дэманструе прыклад. На экране тэлефона бачны здымак, які даслаў беспілотнік. Відаць нешта белае, што ляжыць на зямлі. Вельмі падобна на знясіленага чалавека, які ўпаў, не выбраўшыся з гушчару. Але калі туды дайшоў выратавальны ланцужок, то аказалася, што па «законе подласці» рухаецца не ў свой населены пункт, а ў процілеглым кірунку. Пошукі ж могуць даходзіць да трох дзён. Але бывае і больш — усё залежыць ад велічыні ляснога масіву.

І вось мы выязджаем у лес, які знаходзіцца блізу Маладзечна. Па легендзе, менавіта тут згубіўся чалавек. На месцы ўладкоўваецца сітуацыйны штаб. Ім кіруе **намеснік начальніка атрада па матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні Аляксандр КАНКАЛОВІЧ.** Гучыць каманда — і ў лес адпраўляецца квадрацыкл.

— Арсенал у нас даволі вялікі: тут і GPS-трэкеры, і рацыі для перамоў, і ліхтары, і біноклі, — пералічвае Аляксандр Канкаловіч. — Калі мы адпраўляемся на баявы выезд, то абавязкова прыганяем пажарны аўтамабіль, які будзе падаваць сірэну. Па сцежках мы перасоўваемся на квадрацыкле. Па дарогах агульнага карыстання на ім ездзіць забаронена, а вось на лясных дарожках гэта незаменны памочнік. Актыўна выкарыстоўваем і квадракоптары. Праўда, часам з беспілотніка не разгледзець, што менавіта адбываецца ўнізе.

Аляксандр Канкаловіч дэманструе прыклад. На экране тэлефона бачны здымак, які даслаў беспілотнік. Відаць нешта белае, што ляжыць на зямлі. Вельмі падобна на знясіленага чалавека, які ўпаў, не выбраўшыся з гушчару. Але калі туды дайшоў выратавальны ланцужок, то аказалася, што гэта быў кінуты кімсьці мех з-пад бульбы.

— Дрэнны жарт адыгрывае самаўпэўненасць. Чалавек, які жыве ў пэўнай мясцовасці доўгі час, думае, што лес ён ведае як свае пяць пальцаў. А вось і не. Дастаткова прапусціць усяго адзін вядомы паварот, як арыентацыя будзе згублена. І чалавек пачне апісваць па лесе кругі радыусам у некалькі кіламетраў, але пры гэтым у яго будзе стварацца ілюзія, што ён ідзе прама. А калі прыходзіць усведамленне, што заблукаў, — псіхіка можа спрацаваць па-рознаму. Часцей за ўсё пачынаецца паніка: адзначае Аляксандр Канкаловіч. — Вось нядаўна быў у нас такі выпадак у Пухавіцкім раёне. Згубіліся дзве жанчыны. Сувязь мы з імі трымалі. І вось адна з іх кажа — у маёй «напарніцы» праблемы, я не магу яе спыніць, яна хоча ісці далей. Але ўсё-такі нам удалося пераканаць яе застацца на месцы. Там і знайшлі. Але ёсць і контрпрыклад. Нядаўна мы выязджалі ў Мядзел, дзе трое сутак шукалі 83-гадовага дзядулю. Ён пайшоў зранку ў лес па грыбы, пасля ўдзень вярнуўся, паеў і... зноў адправіўся ў лес. І вось у другі раз дадому ўжо не вярнуўся. Пакуль мы прачэсвалі лес, з'явілася інфармацыя, што яго бачылі на дарозе. І зведстві спраўдзіліся. Аказалася, што ён згубіў арыентацыю ў прасторы. Стары пераначаваў у лесе, а пасля выйшаў з лесу на яго процілеглым канцы і нават не зразумеў, што згубіўся. Ці вось як мы знайшлі бабулю ў Маладзечанскім раёне. На яе мы натрапілі ўначы. Старая ўжо не магла ісці. Адзінае, праціла, каб не згубілі сабраныя грыбы...

Калі коратка распавесці пра працу штаба, то выглядае гэта так. На карце ствараецца сетка дарог, якую мусяць прайсці пошукавікі. Яна грузіцца ў трэкер для кожнага супрацоўніка. Ёй і кіруецца ратаўнік падчас прачэсвання мясцовасці. І вось так група праходзіць сцежку за сцежкай. Спачатку «закрываюцца» тыя квадраты, дзе большая верагоднасць знайсці чалавека, калі ж працы не скончыліся поспехам — прачэсваюцца ўсе астатнія.

Ход усіх работ можна бачыць на экране ноўтбука ў анлайн-рэжыме.

Тым часам да нас з лесу сам выйшаў чалавек. З сабой ён нёс поўнае вядро сабраных грыбоў.

— Баравікі, падасінавікі, махавікі, — пералічвае Віктар Рыбалоўскі. — Дажджоў тут наліло шмат, ды яшчэ і цёпла. Вось і пайшлі грыбы. Але як ні дзіўна, сёння

я пайшоў у грыбы першы раз на год. Падабаецца сам працэс — адпачываю душой. А ў лесе арыентуюся па сонцы і стараюся далёка не заходзіць. Ды і навошта ісці кудысьці ў гушчар — вунь вядро за паўгадзіны назбіраў.

А вось жыхару Вілейкі Віктару Буцько пашанцавала крыху менш. Літаральна за дзень да на-

шага прыезду яго шукалі ў лесе ратаўнікі.

— Пайшлі разам з сябрам у грыбы раніцай. Набралі кожны па вядры. Вярнуліся, папілі гарбаты і... вырашылі схадзіць яшчэ раз, толькі ў іншае месца. Думалі, што не заблукаем, але выйшла інакш. Таму хачу параіць браць з сабой у вандроўкі па лесе не толькі тэлефон, але і компас, каб трымаць напрамак. Праўда, мы выйшлі з лесу ўвечары, але за дзясятак кіламетраў ад дома. Сталі вяртацца назад па дарозе — і сустрэліся з машынай ратаўнікоў.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

❍ Кампетэнтна

Дзіяна ЖАЛЯЗНЯК, афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях:

— Грыбны сезон цяпер у самым разгары. Але выпадкі, калі людзі губляюцца, вельмі частыя. Кожныя суткі некалькі разоў ратаўнікі выязджаюць, каб дапамагчы такім «рабінзонам». Зараз гэта адбываецца радзей, чым тыдзень назад (тады колькасць выклікаў даходзіла да дзесяці на суткі. Таму да паходу ў лес важна правільна падрыхтавацца. Камуфляж пакіньце дома. А вось галаўны ўбор пажадана мець яркі. Вазьміце з сабой запас ежы, вады, медыкаменты і зарадзіце мабільнік.

Калі ж так здарылася, што згубіліся, — не панікуйце. Старайцеся знайсці арыенцір, які прывядзе вас да людзей. Гэта могуць быць лініі электрапередачы, ручай, сцежка, дарога. Сабачы брэх чуваць да двух кіламетраў, шум цягніка — да дзесяці. Калі ж не можаце выйсці да надыходу цемры — рыхтуйцеся да начлегу. Выберыце месца глыбейшае. Гэта можа быць яма ад вывернутага дрэва. Прытулак лепш зрабіць падобным на шалаш. Але звонку пакіньце яркі элемент, каб ён выдаў ратаўнікам ваша месцазнаходжанне.

❍ Тым часам

Толькі за пазамінулыя суткі ратаўнікі па ўсёй краіне адшукалі 17 чалавек, якія заблукалі ў лясах. Пра гэта паведамілі ў прэс-службе МНС.

14 верасня ў 11.25 ратавальнікам паступіла паведамленне аб тым, што каля вёскі Малевіцкая Рудня Жлобінскага раёна зніклі муж і жонка. Крыху пазней прыйшло паведамленне ўжо з Чавус — там каля станцыі Пераможнік у лесе заблукалі маці і пяцігадовы сын. У другой палове дня званок прыйшоў ужо з лесу. Тэлефанавала жанчына, якая праціла адшукаць яе з сяброўкай у лесе паблізу вёскі Дашкі Лагойскага раёна. Бліжэй да вечара стала вядома, што ў Шаркаўшчынскім раёне з лесу не могуць выйсці ажно шэсць чалавек.

Усіх іх знайшлі. Выратаваныя не мелі патрэбы ў дапамозе медыкаў. А вось пошукі яшчэ чатырох расцягнуліся і на аўторак. Прычым трое з іх — пенсіянеры ва ўзросце за 80. Іх шукалі ў лясах Лёзненскага, Глускага і Гомельскага раёнаў.

Бізнес

КРЫНІЦЫ ЭКАНАМІЧНАГА РОСТУ

28 пагадненняў аб супрацоўніцтве на агульную суму 292 мільёны беларускіх рублёў было падпісана на другім раённым інвестфоруме «Магілёўскі раён — тэрыторыя магчымасцяў». З іх 250 мільёнаў рублёў — гэта грошы, якія плануецца прыцягнуць у эканоміку, і 42 мільёны — атрымаць за конт экспартных кантрактаў. Так, прадстаўнік з Германіі заключыў пагадненне з Магілёўскім агенцтвам рэгіянальнага развіцця, а Магілёўскі райвыканкам — з кітайскай правінцыяй Яньцын.

Усяго ў форуме прыняло ўдзел больш чым сто прадстаўнікоў бізнесу і дзелавой супольнасці з Беларусі, Расіі, Германіі, Кітая, Японіі і Турцыі.

— Першы раённы бізнес-форум зарэкамендаваў сябе як перспектыўная пляцоўка для канструктыўнага дыялогу ўлады з прыватным бізнесам, а другі гэта яшчэ раз пацвердзіў, — адзначыў **старшыня Магілёўскага раённага выканаўчага камітэта Алег ЧЫКІДА.** — Менавіта інвестыцыі з'яўляюцца самымі эфектыўнымі крыніцамі эканамічнага росту, а іх галоўнае прызначэнне — стабільнае развіццё і павышэнне ўзроўню жыцця людзей.

Удзельнікі азнаёміліся з выставай эканамічнага патэнцыялу Магілёўскага раёна, абмеркавалі перспектывы развіцця бізнесу, узаемадзеяння суб'ектаў гаспадарання з органамі дзяржкіравання, шляхі інтэграцыі ў сусветную эканамічную прастору.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота з сайта інфармацыйнага агенцтва Mogilevnews.

Медыцынскі турызм: паўза ці новы імпульс?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сёлета сітуацыя іншая. За паўгода прысутнасць замежнікаў у гродзенскіх санаторыях скарацілася амаль у тры разы. Паўза зразумелая — сусветныя камунікацыі зменшыліся з-за пандэміі. Але разам з гэтым паўстае пытанне: ці не страцяць санаторыі свайго замежнага турыста? Ці зможа развівацца медыцынскі турызм і надалей? Каб гэта высветліць, я дамовілася аб наведванні адной з самых прэстыжных і камфартабельных здраўніц рэгіёна — ААТ «Санаторый «Азёрны».

Гэты аздараўленчы комплекс папулярны як у беларусаў, так і ў замежных грамадзян. Некаторыя прыязджаюць сюды гадамі. Як, напрыклад, гэта робіць сям'я Мышко з Вільнюса. Сёлета яны тут восьмы раз. Цікаўлюся, ці не беларусы яны, бо прозвішча гаворыць само за сябе. Аказалася, што Алег — з Магілёўшчыны, а ў Гродне жывуць яго брат і іншыя сваякі. Ала — расіянка, а лёс звёў іх у літоўскай сталіцы, там і засталіся жыць. У Беларусь прыязджаюць часта, жартуюць, што ўсё пачалося з настальгічнага турызму. Напачатку прыязджалі да сваякоў, а потым вырашылі прыехаць сюды і на аздараўленне. Паступова азнаёміліся з санаторнай базай. Брат Алега, гродзенскі ўрач, параіў паехаць у санаторый «Азёрны». Цяпер штогод прыязджаюць. Пасябравалі з персаналам. Госці з Вільнюса лічаць прафесіяналізм і ветлівасць медыкаў аднымі з галоўных пераваг беларускага санаторыя.

— Мы былі ў літоўскіх санаторыях у Бірштанісе і ў Друскінінкае. Я параўнала масаж — там мяне проста гладзілі, а тут неяк больш вызначана. І наогул вельмі ўважліва ставяцца, гэта многае значыць. Вельмі добрыя суадносіны цаны і якасці. Токі, лімфадрэнаж, лячэбная гразь, ванны. Сёлета мне параілі баракамеру. Усе гэтыя працэдуры літаральна ставяць нас на ногі, — пералічвае плюсы Ала.

Фота Яна ХВЕДЫНІ.

Нават сёлетні складаны ў плане праезду сезон не спыніў грамадзян Літвы. Праўда, прыходзілася некалькі разоў адкладваць, каб не трапіць па вяртанні дадому ў самаізаляцыю. Але сітуацыя так імкліва мянялася, што падгадаць такое «акно» не атрымалася. Таму вырашылі ўсё роўна ехаць, хоць два тыдні потым прыйдзецца правесці дома.

Па словах менеджара па турызме Міхаіла Кажуры, гасцей з Літвы і ўвогуле з Прыбалтыкі значна прыбавілася. Гэтаму паспрыяў бязвізавы рэжым з тэрмінам знаходжання 15 дзён для тых, хто едзе ў беларускія санаторыі. Да таго ж замежнікам не трэба клапаціцца пра афармленне дакументаў — усё гэта робіцца ў самім санаторыі. Анкету адсылаюць у пагранкамітэт, дзе вызначаецца яе штрых-код, потым дакумент адпраўляюць замежніку, які раздрукоўвае яго і прадстаўляе на граніцы.

Відавочна, што сёлетняя сітуацыя ўнесла свае карэктывы ў прыём гасцей з-за мяжы — іх колькасць рэзка знізілася. Між тым нельга сказаць, што такіх турыстаў наогул няма. У санаторыі гэту сітуацыю лічаць часовай і робяць усё магчымае, каб не страціць свой кантынгент.

— У першую чаргу тут звяртаюць увагу на медыцынскую базу. Зараз гэта адзін з важных фактараў прыцягвання замежнікаў. Таму ў «Азёрным» ідуць па шляху пастаяннага аднаўлення і пашырэння паслуг.

Другі значны фактар — аздараўленчыя праграмы па васьмі кірунках. У гарадскіх паліклініках такіх праграм няма, расказвае ўрач-рэабілітолаг Галіна Якубенка. Яна адзначыла, што людзі, якія прыязджаюць у санаторый, вельмі цікавяцца гэтымі праграмамі.

І трэці важны аспект — медыцынская дыягностыка і лячэнне. У санаторыі працуюць урач-уролаг, анколаг, стаматолаг, дыягност. Акрамя таго, існуе дамоўленасць з абласной клінічнай бальніцай, дзе ёсць магчымасць не толькі прайсці кансультацыю вузкіх спецыялістаў, але і зрабіць комплекснае дыягнастычнае абследаванне за 1-3 дні, у тым ліку і МРТ. Дарэчы, гэта адна з самых папулярных медыцынскіх паслуг сярод замежнікаў. У Гродне па гэтай тэхніцы выконваюць сканіраванне ўсяго цела для выяўлення анкалагічнага захворвання. А калі чалавек з'язджае, атрымлівае медыцынскія рэкамендацыі.

— У канцы года мы глядзім, якое абсталяванне выходзіць са строю, штосьці з'яўляецца новае, наведваем выстаўкі медабсталявання, набываем тое, што запатрабавана, — тлумачыць фізіятэрапеўт Ганна Аўгуль.

Медыцынская база асабліва прывабная для замежнікаў, кажа суразмоўца. Прыбалты, палякі, расіяне прыязджаюць менавіта аздаравіцца. Яны не ўтойваюць, што ў сябе дома заплацяць за адну працэдуру, як тут за цэлы комплекс. Замежнікі карыстаюцца тымі паслугамі, якія не пакрываюць унёскі па страхавой медыцыне ў іх краінах. Разам з тым узровень дапамогі наведвальнікі санаторыя ацэньваюць як еўрапейскі. Менавіта так вызначыла сваё меркаванне грамадзянка Расіі Алена Стэльмах.

Мы размаўляем з сямейнай парай з Санкт-Пецярбурга літаральна паміж працэдурамі. Алена спяшалася на падводную выцяжку, дзеля якой, уласна кажучы, і прыязджае ў «Азёрны». Вельмі добра, што ёсць магчымасць абследавацца, скарыстацца касметычнымі працэдурамі, лічыць яна.

— Мяне крыху здзіўляе, што беларусы часта наракаюць, што тут дорага, што санаторый больш скіраваны на замежных турыстаў, але як можа быць танна, калі мы бачым, колькі тут укладзена? — задаецца пытаннем жанчына. — Многія працэдуры робяцца на замежным абсталяванні, тэрыторыя прыгожа афармлена. Зразумела, што санаторыю патрэбна зарабляць грошы, бо ён на самаакупнасці.

У Расіі многія робяць стаўку на камфорт, і адпаведна ў санаторыі ёсць камфортныя нумары. На думку Алены, «Азёрны» па ўзроўні нагадвае нават горныя фешэнебельныя курорты, а цэнавы фактар зусім іншы. Там адпачынак будзе каштаваць у 2-3 разы даражэй. Таму многія расіяне аддаюць перавагу беларускім здраўніцам. Ці захаваецца такая тэндэнцыя надалей? Ні Алена, ні яе муж Андрэй у гэтым не сумняваецца. Яны самі прыязджаюць сюды другі раз і налета таксама мяркуюць прыехаць.

— У Піцеры вільгаць, прастудныя захворванні, таму для нас важна надыхацца свежым паветрам і ўмацаваць здароўе. Тут ёсць усё і для ўсіх. Ёсць з чым параўнаць, — кажа Андрэй.

Між іншым, у санаторыі не згаджаюцца, што іх установа скіравана на замежнікаў. Здраўніца папулярная і ў беларусаў. Многія прыязджаюць не ўпершыню. У фае сустрэлася з адной такой сям'ёй з Мінска. Дык вось Святлана і Ігар Суськовы прыязджаюць сюды ўжо чацвёрты раз, прычым з дзецьмі. Умацаваць імунітэт, па словах Святланы, дапамагаюць возера, аквапарк, саляны пакой і чароўная прырода. А яшчэ тут шмат забаў для дзяцей, прычым з кожным годам з'яўляецца нешта новае.

Фота Маргарыты УШКЕВІЧ.

Увогуле сямейны адпачынак становіцца прыярытэтным у большасці беларускіх санаторыяў. Спрыяе гэтаму і дамашняя атмасфера здраўніц. А ў «Азёрным» лечаць не толькі цела, але і душу. На тэрыторыі санаторыя пабудавана царква, асвечаная ў гонар Пятра і Паўла. А ўся тэрыторыя займае 16 гектараў сярод чыстага хвойнага лесу. Дарэчы, для Ігара і Алены Садоўнікавых, якія прыехалі з Казані, менавіта прырода ў прыярытэце. Пешы мацыён па лясных асфальтаваных сцяжынках яны робяць штодзень і сцвярджаюць, што гуляць тут прыемна ў любую пару года.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

У тэму

Экспарт медыцынскіх паслуг да сёлетняга года павялічваўся на 10 %. На гэтым сектары турызму Гродзенская вобласць зарабіла больш за мільён долараў ЗША, што з'яўляецца даволі значнай лічбай. Лідарам па аказанні паслуг можна лічыць абласную бальніцу. За год тут праходзяць лячэнне ад 600 да 800 замежнікаў. У аддзяленні платных медыцынскіх паслуг Гродзенскай бальніцы хуткай дапамогі большасць платных пацыентаў да нядаўняга часу складалі менавіта прадстаўнікі замежных краін. Многія звяртаюцца, каб зрабіць дыягностыку, пластычную аперацыю ці замяніць каленны сустаў.

А вось турыстычныя фірмы не вельмі імкнуцца «прасоўваць» медыцынскі турызм. У турыстычнай фірме «ЗЭТ» лічаць, што сітуацыя можа палепшыцца, калі медыцынскія ўстановы будуць рабіць адпаведныя адлічэнні за паслугі турыстычным кампаніям. Разам з тым у турыстычнай фірме пагаджаюцца: медыцынскі турызм мае попыт сярод замежнікаў, асобнае месца ў ім займаюць беларускія здраўніцы.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельский рыбокомплекс» (продавец) в лице управляющего в деле о банкротстве Журова С. В., извещает о проведении 29 сентября 2020 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 50 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб.	Шаг аукциона – 5 %, бел. руб.	Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб.
	Условие продажи: 1. Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. 2. Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств, а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производится Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. 3. Лоты расположены на земельном участке с кадастровым номером **340100000002000638** площадью **2,0237 га,** предоставлены ОАО «Гомельский рыбокомплекс» на праве постоянного пользования. После проведения аукциона Продавец уполномочивает покупателя в установленном законодательством порядке обратиться за осуществлением **необходимых действий, направленных на выделение и регистрацию земельных участков**, необходимых для обслуживания предметов аукциона, а также проведение государственной регистрации договора купли-продажи. Покупатель осуществляет регистрационные действия по выделению земельного участка в границах, определенных специализированными службами, согласованными с продавцом. Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, оформлению земельного участка, государственной регистрации договора купли-продажи и перехода права собственности на предмет аукциона возлагаются на покупателя. В связи с обеспечением возможности для каждого из образованных в результате раздела (выделения, деления) земельных участков беспрепятственных подъездов (подходов) для организации доступа к ним с целью содержания и обслуживания покупателями приобретенных зданий и сооружений в соответствии со ст. 268 ГК Республики Беларусь, ст.ст. 19, 45 «Кодекса Республики Беларусь о земле» установить право ограниченного пользования чужим недвижимым имуществом (сервитут) на объекты недвижимости (земельные участки), через которые покупатели каждого из выставляемых на аукцион лотов после их приобретения имели бы доступ к ним с целью содержания и обслуживания приобретенных зданий и сооружений. 4. В соответствии с действующим законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 %			
	Местонахождение: Гомельская обл., Гомельский р-н, г. Гомель, ул. Шилова, д. 16			
1	**В составе: капитальное строение с инв. № 350/С-51855** общей площадью **201,1 кв. м,** назначение – здание административное, наименование – **одноэтажное кирпичное административное здание.** Здание административно-хозяйственная, холодная пристройка (инв. № 0003). Капитальное строение (инв. № 0004, № 0055, № 0054) общей площадью **167,3 кв. м,** наименование – **здание бойлерной.** Капитальное строение (инв. № 0007), общей площадью **111,0 кв. м,** наименование – **здание павильона ПК-24 (бытовки грузчиков)**. Капитальное строение (инв. № 0005) общей площадью **12,8 кв. м**, наименование – **здание проходной**. Склад ГСМ (инв. № 0025). Склад (инв. № 0032). Склад (инв. № 0031). Склад (инв. № 0035). Склад (инв. № 0024).Склад (инв. № 0030). Склад (инв. № 0028). Склад (инв. № 0027). Навес (инв. № 0033). Навес (инв. № 0029). ТУ (теплоузел 11, инв. № 0023). ТП (инв. № 0026). Гараж (инв. № 0036). Эстакада (инв. № 0037). Ворота (инв. № 1000). Ворота (1001). Ограждение мет. (инв. № 1001). Ограждение (забор кирпичный, инв. № 1002). Проезжая часть (асфальтовое покрытие, инв. № 1008). Кондиционер Windair WRH-091NBE (инв. № 3449). Кондиционер Windair WRH-091NBE (инв. № 3448). Кондиционер Hyundai HSH-S241 NBE (инв. № 3450). Мини-АТС (с телеф. аппаратурой, 9 шт.) (инв. № 3241). Кондиционер Ballu BSR-0,9 H (инв. № 3330). Автомат ЭМ16 (инв. № 3237). Агрегат KM-80-65-160 (инв. № 3336). Сигнализация (административное здание) (инв. № 3305). Сигнализация (магазин) (инв. № 3326). Сигнализация (склад) (инв. № 3303). Шкаф учета (инв. № 3323)	**615 575,00**	30 778,75	61 557,50
2	**Капитальное строение с инв. № 350/С-51854**, общей площадью **897,9 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание санитарное обработки тары.** Линия очистных сооружений (инв. № 1005). Капитальное строение (инв. № 0006) общей площадью **30,0 кв. м,** наименование – **погреб-склад ГСМ**	**101 400,00**	5 070,00	10 140,00
6	Термодымокамера УК-3 (камера коптильная) (инв. № 3206)	**1 350,00**	67,50	135,00
7	Теплосети (инв. № 2002)	**3 750,00**	187,50	375,00
8	**Автомобиль ГАЗ 3307 «КУПАВА»** 473800, год выпуска – 2008, рег. № АВ 6424-3, тип ТС – грузовой фургон-рефрижератор, удовлетворительное техническое состояние, цвет – белый. СКТР 25 терминал ON-LINE (инв. № 3341)	**3 650,00**	182,50	365,00
9	Смеситель для получения однородного рассола с насосом (инв. № 3339)	**950,00**	47,50	95,00
10	Машина разгрузочно-моечная МРМ X940M (инв. № 3290)	**4 750,00**	237,50	475,00
12	Линия производства рыбных пресервов (инв. № 3196)	**1 400,00**	70,00	140,00
13	Котел пищеварочный КЭ-250 (инв. № 3210)	**435,00**	21,75	43,50
14	Котел пищеварочный КЭ-250 (инв. № 3209)	**435,00**	21,75	43,50

Продавец: ОАО «Гомельский рыбокомплекс», г. Гомель, ул. Шилова, 16. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8 (044) 534-93-34 Петрушенко Михаил Михайлович, 8 (044) 733-03-49 – управляющий в деле о банкротстве Журов Сергей Вячеславович. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 16 сентября 2020 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 25 сентября 2020 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. **Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 5 (пять) дней до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором торгов** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) за организацию и проведение торгов, возместить затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** с момента его подписания. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», стр. 127–129.

Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 05.03.2020 г. № 44 (29158). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by или www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by.

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Сахарторг» (продавец) извещает о проведении 29 сентября 2020 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 30 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
1	**Незавершенное законсервированное капитальное строение с инв. № 350/U-169494 площадью 1 176,4 кв. м**, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **незавершенное законсервированное капитальное строение.** Адрес: г. Гомель, ул. Чечерская, д. 42А. Степень готовности – 75 %. **Информация о земельном участке:** объект расположен на земельном участке с кадастровым номером **340100000002004549** общей площадью **0,0894 га** – для строительства магазина продовольственных товаров. **Право аренды**. Местонахождение: **г. Гомель, ул. Чечерская (микрорайон № 21). Информация о земельном участке:** объект расположен на земельном участке с кадастровым номером **340100000002005356** общей площадью **0,0297 га** – для строительства магазина продовольственных товаров (участок № 1). **Право аренды**. Местонахождение: **г. Гомель, ул. Чечерская (микрорайон № 21). Информация о земельном участке:** объект расположен на земельном участке с кадастровым номером **340100000002005357** общей площадью **0,0072 га** – для строительства магазина продовольственных товаров (участок № 2). **Право аренды**. Местонахождение: **г. Гомель, ул. Чечерская (микрорайон № 21)**	**839 160,00**	41 958,00

Продавец: ОАО «Сахарторг», г. Гомель, ул. Могилевская, д. 1а. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8 (0232) 21-00-34 – Земляная Виктория Викторовна (зам. директора ОАО «Сахарторг»). **Шаг аукционных торгов – 5 %. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Сахарторг»):** р/с BY67 BLBB 3012 0400 0783 7200 1001 Дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области (г. Гомель, ул. Советская, 7), БИК BLBBBY2X, УНН 400078372, ОКПО 28834675, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах за лот № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 16 сентября 2020 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. **Прием заявлений (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов) заканчивается 25 сентября 2020 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **30 (тридцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 05.08.2020 г. № 150 (29264). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: (тел./факс) 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**

Продавец: **ЗАО «Райагропромэнерго»** (УНП 700003443) в лице ликвидатора Осипенко А. Г., тел. +375 29 155-37-27.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **30 сентября 2020 г. с 09.00 до 17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

Предмет торгов –

здание многофункциональное, с инв. № 710/С-74354, г. Бобруйск, ул. Гоголя, д. 188, здание котельной, с инв. № 710/С-2705, г. Бобруйск, ул. Гоголя, д. 188/1, здание распределительного устройства, с инв. № 710/С-74953, г. Бобруйск, ул. Гоголя, д. 188/2.

Начальная цена предмета торгов – 140 000,00 бел. руб. с НДС. Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Телефон для ознакомления и осмотра: +37529 155-37-27.

Для участия в торгах необходимо в срок с 17.09.2020 г. с 09.00 по 29.09.2020 г. до 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее десяти рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах опубликовано в газете «Звязда» от 22.07.2020 г.

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Тепличный комбинат Мачулищи»

Лот № 1: камера т/изоляционная холодильная низкотемпературная КХН-5,51. Инв. № 00010006307. Цена – 972,00 руб. Задаток – 48,60 руб. **Лот № 2:** воздухоохладитель WFBL 3-39E. Инв. № 00010006388. Цена – 516,00 руб. Задаток – 25,80 руб. **Лот № 3**: камера т/изоляционная холодильная КХН-4,41. Инв. № 00010006305. Цена – 900,00 руб. Задаток – 45,00 руб. **Лот № 4**: воздухоохладитель WKBM 3-895E. Инв. № 00010006384. Цена – 516,00 руб. Задаток – 25,80 руб. **Лот № 5**: камера т/изоляционная холодильная КХН-5,51. Инв. № 00010006309. Цена – 804,00 руб. Задаток – 40,20 руб. **Лот № 6**: воздухоохладитель WKBM 3-895E. Инв. № 00010006386. Цена – 516,00 руб. Задаток – 25,80 руб. **Лот № 7**: камера т/изоляционная холодильная КХН-6,61. Инв. № 00010006299. Цена – 696,00 руб. Задаток – 34,80 руб. **Лот № 8**: воздухоохладитель WKBM 3-895E. Инв. № 00010006383. Цена – 516,00 руб. Задаток – 25,80 руб. **Лот № 9**: камера т/изоляционная холодильная низкотемпературная КХН-5,51. Инв. № 00010006306. Цена – 972,00 руб. Задаток – 48,60 руб. **Лот № 10**: воздухоохладитель WFBL 3-39E. Инв. № 00010006387. Цена – 516,00 руб. Задаток – 25,80 руб. **Лот № 11**: камера т/изоляционная холодильная КХН-5,51. Инв. № 00010006308. Цена – 804,00 руб. Задаток – 40,20 руб. **Лот № 12**: воздухоохладитель WKBM 3-895E. Инв. № 00010006385. Цена – 516,00 руб. Задаток – 25,80 руб. **Лот № 13**: конденсатор KCE 64C2. Инв. № 00010006381. Цена – 3 840,00 руб. Задаток – 192,00 руб. Цена по лотам № № 1–13 является начальной ценой с учетом НДС. **Местонахождение** лотов: Минский р-н, г. п. Мачулищи, ул. Солнечная, 6. Шаг аукциона – 5 %.

Аукцион состоится 21.10.2020 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by**. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений и задатков – 19.10.2020 в 11.00.

☎ Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Тепличный комбинат Мачулищи»

Лот № 1: пресс листогибочный гидравлический с ЧПУ модели CNC AP 4100-220. Инв. № KT50000260. Цена – 45 120,00 руб. Задаток – 2 256,00 руб. **Лот № 2:** ленточно-шлифовальный станок GARBOLIod. LPC300WET. Инв. № KT55001. Цена – 14 280,00 руб. Задаток – 714,00 руб. **Лот № 3**: ножницы Н42. Инв. № KT00071083. Цена – 1 560,00 руб. Задаток – 78,00 руб. **Лот № 4**: универсальный поворотный делительный стол с УЦИ4. Инв. № KT25000. Цена – 6 720,00 руб. Задаток – 336,00 руб. **Лот № 5**: станок сверлильно-фрезерно-расточной горизонтальный 2206ВМФ4-07, в составе: 1. Мех. база сверлильно-фрезерно-расточного станка с ЧПУ мод. 2206ВМФ4. Инв. № KT49605. 2. Станок фрез.-расточн. 2206 ВМФ4-03 без мехбазы (м/б Александрийская). Инв. № KT00020818. Цена – 6 600,00 руб. Задаток – 330,00 руб. **Лот № 6**: станок сверлильно-фрезерно-расточной горизонтальный 2206ВМФ4-07, в составе: 1. Станок расточной модели 2206ВМФ без ЧПУ и электроприводов (мехбаза к станку инв. № 20966). Инв. № KT1520344. 2. Станок свер.-фр.-раст. с ЧПУ 2206ВМФ4 без мехбазы (м/б № 1520344). Инв. № KT00020966. Цена – 6 600,00 руб. Задаток – 330,00 руб. **Лот № 7**: пылеулавливающий агрегат УВП-2000А. Инв. № KT50000180. Цена – 636,00 руб. Задаток – 31,80 руб. **Лот № 8**: пылеулавливающий агрегат УВП-2000А. Инв. № KT50000199. Цена – 636,00 руб. Задаток – 31,80 руб. **Лот № 9**: станок прод.-фрез. 6М612МФ4. Инв. № KT00020826. Цена – 48 240,00 руб. Задаток – 2 412,00 руб. **Лот № 10**: станок вертикально-сверлильный 2н125. Инв. № KT00020907. Цена – 1 320,00 руб. Задаток – 66,00 руб. **Лот № 11**: полуавтомат заточный 3Д692. Инв. № KT00020729. Цена – 2 040,00 руб. Задаток – 102,00 руб. **Лот № 12**: ножницы гильотинные НД-39. Инв. № KT0021202. Цена – 1 104,00 руб. Задаток – 55,20 руб. **Лот № 13**: вертикальн. консольно-фрезерный станок мод. FSS450R. Инв. № KT55526. Цена – 8 400,00 руб. Задаток – 420,00 руб. Цена по лотам № № 1–13 является начальной ценой с учетом НДС. **Местонахождение** лотов: Минский р-н, г. п. Мачулищи, ул. Солнечная, 6. Шаг аукциона – 5 %.

Аукцион состоится 19.10.2020 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.** Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений и задатков – 15.10.2020 в 11.00.

☎ Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

Уладзімір ДРАЖЫН:

«КАЛІ НЕ БЫЦЬ КРЫТЫЧНЫМ, ТО МОЖНА ДАПУСЦІЦЬ ШМАТ ПАМЫЛАК У ЖЫЦЦІ»

Чалавек нараджаецца, і ніхто не ведае, якімі дарогамі яго будзе весці жыццё. Аднак, як бы ні складвалася наша гісторыя, мы вяртаемся і праносім з сабой пачуццё любові да таго пункту на карце, адкуль пачалася наша дарога... Уладзімір Дражын да сённяшняга дня паспеў напісаць не адну старонку пра тое, чым жыў і дзе аказваўся па наканаванні лёсу, бо папрацаваў настаўнікам, старшынёй райвыканкама, першым намеснікам старшыні аблвыканкама, намеснікам прэм'ер-міністра і паслом Беларусі ў Літве і Фінляндыі. І, мяркую, яго кніга «Дражна. Мая малая радзіма» — гэта якраз тыя старонкі ў яго біяграфіі, без якіх краіна і час атрымалі б зусім іншага чалавека. «Звязда» распытала ва Уладзіміра Несцеравіча пра напісанне кніг, невыпадковыя сустрэчы і літаратуру, якая выхоўвае асобу.

— Уладзімір Несцеравіч, раскажыце, як наспела думка расказаць пра месца, у якім вы нарадзіліся, у фармаце кнігі «Дражна. Мая малая радзіма»?

— Думка аб напісанні гэтай кнігі з'явілася ў мяне ўжо ў сталым узросце, калі атрымаў пасаду Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь у Літве і Фінляндыі. І вось там, за мяжой (не заўсёды была магчымасць прыехаць дадому і ўбачыць, як тут жывуць твае дзеці і ўнукі), з'явілася настальгія па радзіме, задума напісаць пра сваю вёску. Аднойчы рэктар Віленскага ўніверсітэта, з якім мы пасябравалі, распавёў, што ў іх архіве засталося шмат матэрыялаў, якія датычацца Беларусі. Мне было цікава паглядзець. Перш за ўсё звярнуў увагу на фотаздымкі. І гэта былі фота на шкле, зробленыя ў 1911 годзе беларускім этнографам Ісаакам Сербавым. Я пра яго напісаў у кнізе. Мы не змаглі паглядзець усе 480 здымкаў, але сярод іх я ўбачыў 21 фота, дзе была вёска Дражна 1911 года. Разглядваючы іх, я знайшоў выяву маёй бабулі па мацярынскай лініі (хоць у мяне не засталося ніводнага фотаздымка з ёю). Як кажуць, зоркі сышліся. Папрасіў у рэктара копіі. Вось адкуль усё пачалося. І гэты 21 здымак я ўнёс у сваю кнігу «Жыццё люблю бязмерна». Там ёсць асобныя эпізоды пра маю вёску. А потым падумаў, а чаму б не напісаць гісторыю больш разгорнута. Калі я працаваў паслом, то часу пісаць не было. А па заканчэнні дзяржаўнай дыпламатычнай службы (студзень 2014 года) накіраваўся ў архівы (у наш Нацыянальны архіў, у Мінскі абласны архіў, занальны архіў у Слуцку), каб запытаць у іх усе дадзеныя пра маю вёску. Пасля даведаўся, што Дражна некалі з'яўлялася маёнткам князя Радзівіла. І адлік яе гісторыі пачынаецца з 1582 года (а першая згадка ў 1682 годзе). Такім чынам у архівах я знайшоў тыя матэрыялы, якія можна ўбачыць у кнізе. І калі ўжо прывёў усё гэта ў сістэму, то атрымалася 13 раздзелаў, што раскрываюць гісторыю вёскі з даўніны да сённяшняга часу.

Вёска была шматпакутная. Яна трапляла на ўладанні Радзівілаў, потым князя Вітгінштэйна, а затым пана Міхалоўскага з-пад Варшавы. А пасля была рэвалюцыя, часы калгаснага будаўніцтва. І самае страшнае — калі 12 чэрвеня 1920 года польскае войска, якое ступала пад націскам Чырвонай Арміі, спаліла вёску Дражна і побач з ёй Залужжа і Падарэссе. Там забілі каля 83 чалавек, і гэта былі ў асноўным дзеці і старыя людзі, таму што ўсе працаздольныя былі ў гэты час на полі... І сёння я працую над тым, каб устанавіць памятныя знакі там, дзе 100 гадоў таму адбылася трагедыя. Бо важна, каб пра такое помнілі. Вялікая Айчынная вайна таксама наклала адбітак на гэтую мясцовасць. Больш за 90 чалавек не вярнуліся з баёў. І з іх 30 чалавек якія праявілі сябе як людзі працавітыя, як героі вайны. Мой дзядзька, напрыклад, быў франтавым разведчыкам, атрымаў чатыры баявыя ордэны. Я задаволены тым, якую працу для высвятлення ўсяго гэтага ўдалося зрабіць. Пачатак быў у 2010 годзе, калі я перастаіў парог архіва Віленскага ўніверсітэта, а заканчэнне — у 2020 годзе.

— Ці часта зараз вам выпадае бываць на малой радзіме?

— Я, калі пайшоў з дому, то працаваў у розных месцах. А праз нейкі час мяне прызвалі ў армію. Там я таксама добра паказаў сябе, і мне сказалі, што атрымаю накіраванне на вучобу ў ВНУ. Я атрымаў яго, але здарыліся вядомыя падзеі ў Чэхаславакіі. Там народ падняўся супраць існуючага рэжыму. Я не паехаў паступаць, працягваў службу. А калі вярнуўся з арміі, паабяцаў сабе бываць дома кожны месяц. У вёсцы ж працы хапае, незалежна ад пары года. Таму, працуючы ў Жодзіне на аўтазаводзе, заўсёды ездзіў дадому. А потым, калі ўжо стаў на сталую працу, то таксама наведваў бацькоў амаль штомесяц. Калі ж бацькі не стала і маці засталася адна, то гэта ўжо было абавязковай справай. Росквіт вёскі, лічу, прыпаў на 70—80-я гады. Цяпер такога няма і ўжо, мусіць, не будзе.

«Калі ты беларус, то павінен ведаць сваю мову. Гэта павінна быць ад душы. Я і дзецям гавару, што без ведання беларускай мовы мы нямеем».

— Ці правільна я разумею, што ў кнізе знайшло адлюстраванне шмат асабістых падзей?

— Так, але, на вялікае шчасце, мой род і па бацькоўскай і па мацярынскай лініі нідзе дрэнна не выглядаў. Усе працавалі і змагаліся як патрыёты. Я сустракаўся з землякамі, іх успаміны аб'ектыўна распавядаюць пра жыццё нашай вёскі. У канцы кнігі я паказаў трох сваіх землякоў па мацярынскай лініі і па бацькоўскай, па прозвішчы Дражын. Блізкія, родзічы. У кнізе ўсіх іх згадваю. Мне хацелася такім чынам рэабілітаваць маіх землякоў, якіх не зусім добра ацэньвалі ў свой час.

— Калі паглядзець на тыя кнігі, якія напісаны вамі і з вашым удзелам, то прасочваюцца ў іх розныя тэмы. Пра што яшчэ хочацца выказацца?

— Людзі задавалі мне пытанне: навошта табе гэта? І адказ на яго я аднойчы прачытаў у Льва Талстога, які пісаў: я хацеў бы, каб будучае пакаленне ведала, што адбывалася ў той час, каб яны маглі маімі вачыма ўбачыць усё. І мне хочацца, каб уся мая гісторыя засталася занатаванай у кнігах. Частка ўжо ёсць — пра вёску, пра мой радавод. Цяпер працую над кнігай пра Нясвіж у маім жыцці і ў жыцці майго пакалення. Потым будзе расповед аб працы ў Мінскім аблвыканкаме і ва ўрадзе. У кнігах «Беларусь—Літва» і «Беларусь—Фінляндыя» ахопліваецца час маёй пасольскай працы. Як бачыце, мне засталося напісаць некалькі кніг, і тады ўсё жыццё будзе занатавана на паперы. Дай бог, каб хапіла здароўя і часу.

— Аднойчы вы параўналі гольф з балетам. А вось калі гаварыць пра важнасць кнігі і літаратуры, то якія вы тут зрабілі б параўнанні, гледзячы праз прызму сённяшніх падзей, даступнасці інфармацыі?

— Я гляджу на сваіх унукаў і бачу, што развіваюцца яны не зусім, як мы кажам, гарманічна. Сядзяць у камп'ютарах і гуляюць у нешта. Я пытаю сябе, што з іх будзе. Разам з тым, разумею, што ў іх зусім па-іншаму фарміруецца ўяўленне пра жыццё і пра ўсё, што адбываецца навокал. Але бяру над імі шэфства і ўвесь час прапаноўваю ім чытанне. З адным з унукаў мы на летніх канікулах прачыталі амаль увесь спіс літаратуры, які быў зададзены на лета. І ўжо бачу, што хлопчык іншы. Яшчэ ў нас ёсць традыцыя, калі мы збіраемся ўсе разам за сталом, то дзейнічае правіла, што размаўляем толькі па-беларуску... За час вучобы ў школе я наведваў школьную бібліятэку, сельсавецкую і раённую. Таму ў школьныя гады вельмі моцна падсілкаваў сябе ў гэтым сэнсе, бо для мяне літаратура — аснова асноў.

— Дзе вы вучыліся размаўляць па-беларуску?

— У школе ў нас усе прадметы выкладаліся на беларускай мове. Я з'яўляюся нашчадкам племені дрыгавічоў, якія жылі на паўночным Палессі. І нас называлі сакунамі. Гэта калі гавораць «наеўса, напіўса», і з гэтым мы прыходзілі ў школу. А там павінны былі гаварыць на беларускай літаратурнай мове. Я вучыўся на выдатна і заўсёды рыхтаваўся да ўрокаў. Таму ўменне валодаць словам выпрацавалася, як добрая звычка. Калі ты беларус, то павінен ведаць сваю мову. Гэта павінна быць ад душы. Я і дзецям гавару, што без ведання беларускай мовы мы нямеем. Мая жонка родам з Расіі, але яна ведае нашу мову. Сярод беларускіх пісьменнікаў люблю творы Янкі Купалы, Якуба Коласа. Мне пашчасціла сустракацца з Міхасём Лыньковым, з Іванам Шамякіным. Я заўсёды схіляўся перад Іванам Мележам. Без літаратуры мы б не склаліся і не існавалі б як нацыя. Бо можна мець шмат грошай, але калі ты не ведаеш літаратуру, то ты чалавек непаўнавартасны. Літаратура фарміруе нас як асобу. Вядома, што ўсё ахапіць нельга, але да гэтага трэба імкнуцца. Я крытычны чалавек у адносінах да сябе і тых, хто побач са мной. Бо калі не быць крытычным, то можна дапусціць шмат памылак у жыцці.

Алена ДРАПКО.
Фота з архіва героя.

БЕЛАРУСЫ ЧЫТАЮЦЬ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА

ААТ «Белкніга» падвяла вынікі продажу кніг у студзені—жніўні сёлетняга года. У рэйтынгу продажаў са ста назваў кніг на беларускай мове, выдадзеных у Беларусі, на першым месцы — «Гары Потэр і філасофскі камень» Дж. Роўлінг. Нашы суайчыннікі набылі ў «Белкнізе» 288 асобнікаў. Другое месца — за раманам «Каласы пад сярпом тваім» Уладзіміра Караткевіча (выдавецтва «Попурри»; у рамана — 203 пакупнікі).

Акрамя гэтага, у рэйтынгу продажаў — наступныя выданні твораў класіка беларускай літаратуры: на пятым месцы — «Дзікае паляванне караля Стаха» (таксама — «Попурри»; прададзена 176 асобнікаў), на дванаццатым месцы — «Чорны замак Альшанскі» (выдавецтва «Попурри», прададзена 107 асобнікаў). У сотню кніг рэйтынга лепшага продажу ўвайшлі яшчэ некалькі выданняў беларускага класіка. «Дзікае паляванне караля Стаха» (выдавецтва «Беларусь») набылі 32 пакупнікі. Яшчэ ў рэйтынгу — «Казкі» і «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» У. Караткевіча (першая кніга — выданне «Беларускай Энцыклапедыі імя Петруся Броўкі»; другая — «Попурри»).

Хто яшчэ з класікаў найболей зацікавіў нашых пакупнікоў? У рэйтынгу «Белкнігі» вылучаюцца кнігі Васіля Быкава, Рыгора Барадуліна, Якуба Коласа, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Івана Мележа. З сучасных пісьменнікаў беларусы болей чытаюць, калі меркаваць па продажах у «Белкнізе», творы Святланы Алексіевіч, Андрэя Федарэнкі, Віктара Марціновіча, Людмілы Рублеўскай, Алены Стэльмах, Валерыя Гапеева, Сяргея Чыгрына.

Сяргей ШЫЧКО.

СЛАВЯНСКІ СВЕТ МАСТАЦКАГА СУГУЧЧА

Ва Украіне выходзіць «беларускі выпуск» літаратурнага часопіса

За перыядычным літаратурна-мастацкім выданнем «Березоль», якое прыняло на сябе эстафету калісьці шырока вядомага харкаўскага часопіса «Прапор», — свая ўласная, досыць багатая на рэтраспектыву гісторыя літаратурных сувязяў Беларусі і Украіны. На старонках выдання друкаваліся вершы народных паэтаў Беларусі Петруся Броўкі, Аркадзя Куляшова, Пімена Панчанкі, Рыгора Барадуліна, творы беларускіх празаікаў, артыкулы і рэцэнзіі, прысвечаныя беларускай літаратуры. І вось — новае судакрананне з беларускай нацыянальнай літаратурай праз мастацкі пераклад.

У адным з наступных нумароў часопіса «Березоль» — вялікая падборка твораў сучасных беларускіх празаікаў у перакладзе на ўкраінскую мову. Дзякуючы перакладчыкам Галіне Тарасюк-Андрашчук і Алесі Сандыга, дыялог з украінскім чытачом вядуць Адам Глобус, Алесь Бадак, Андрэй Федарэнка, Людмила Рублеўская і іншыя беларускія пісьменнікі.

Мікола БЕРЛЕЖ.

СВЯТЛО НАДЗЕІ

110 гадоў таму 17 верасня нарадзілася першы старшыня Вярхоўнага Савета БССР Надзея Грэкава

У гісторыі любой краіны ёсць нямала яскравых, таленавітых жанчын, справы якіх служаць прыкладам для пераймання, яны з'яўляюцца гонарам для сваіх дзяржаў. Для Беларусі, СССР такой яскравай асобай была Надзея Рыгораўна Грэкава, першы старшыня Вярхоўнага Савета БССР, адзіная жанчына ў палітычнай гісторыі Савецкага Саюза, абраная на такі высокі пост на ўсенародных выбарах у 1938 годзе. Выконвала яна гэтыя абавязкі 9 гадоў і з'яўлялася па Канстытуцыі фактычна кіраўніком рэспублікі. Пры гэтым Грэкава адначасова з'яўлялася сакратаром ЦК Кампартыі Беларусі па прамысловасці.

Н. Грэкава з дэлегатамі XVIII з'езда ВКП(б) (7-я злева ў першым радзе), сярод якіх і І. В. Сталін (у цэнтры першага рада). 1939 год.

«Блаславіў» асабіста Сталін

Гэта быў факт, беспрэцэдэнтны не толькі для СССР, але і для Еўропы. Грэкава ўступала ў вялікую палітыку зусім маладой. Ёй было ўсяго 28 гадоў, яна з рабочых, з Ляхаўкі, мінскай ускраіны. За плячыма — прафесіянальна-тэхнічная школа швейнікаў, работа на мінскай швейнай фабрыцы «Кастрычнік», аўтарытэт і выбранне старшынёй Цэнтральнага Камітэта саюза швейнікаў, у які ўваходзіла больш за 17 тысяч чалавек. На пасаду старшыні Вярхоўнага Савета БССР яе «блаславіў» асабіста Сталін. Панцеляймон Панамарэнка, першы сакратар ЦК КП(б)Б, раней чым уносіць кандыдатуру Надзеі Рыгораўны на такую высокую пасаду, вырашыў абмеркаваць яе з Генеральным сакратаром ЦК ВКП(Б) — надта смелай была прапанова. Сталін кандыдатуру ўхваліў, парэкамендаваў толькі змяніць прозвішча з Грэк на Грэкаву. «Няхай усе ведаюць, што ў БССР узначальвае вярхоўны орган улады жанчына. Прозвішча Грэк няясна вызначае, жанчына гэта ці мужчына, а Грэкава — зразумела, што жанчына».

На першай сесіі Грэкаву адзінагалосна абралі старшынёй Вярхоўнага Савета БССР. Тады ж былі прынятыя важныя для рэспублікі дакументы, якія замацоўвалі пастанову аб тэрытарыяльных зменах, што ўносіліся ў Канстытуцыю БССР. Насельніцтва з 1,6 мільёна жыхароў павялічвалася да 6 мільёнаў 122 тысяч, пасля таго, як у 1926 годзе ў склад БССР былі вернуты ўсходне-беларускія землі.

У той жа час у сістэму дзяржаўнага кіравання разам з Грэкавай уступалі такія ж маладыя, як і яна, кіраўнікі, многія з якіх у далейшым стануць палітычнымі фігурамі, і з іх імёнамі будуць асацыіравацца цэлыя перыяды гісторыі СССР — Андрэй Грамыка, Леанід Брэжнеў, Аляксей Касыгін, Мікалай Байбакоў, Панцеляймон Панамарэнка і іншыя. Многім няма і 30. І можна было б сказаць, што наступаў час маладых, калі б не адно «але»: крывавы тэрор 1930-х гадоў, які літаральна выкасіў партыйныя арганізацыі абласцей, рэспублік, а з імі і многіх кіраўнікоў. На долю Грэкавай прыйшоўся, відаць, самы складаны перыяд савецкай гісторыі — 30—50-х гадоў, калі стваралася фактычна з нуля прамысловасць, фарміравалася сістэма кіравання, нарошчваўся культурны патэнцыял рэспублікі і практычна перманентна ішлі рэпрэсіі. Надзея Рыгораўна не толькі курыравала флагманы эканомікі на той перыяд — Аршанскі льнокамбінат і «Асінторф», якія былі на кантролі ЦК. Асноўная ўвага аддавалася мясцовай прамысловасці, горадаўтваральным прадпрыемствам у малых гарадах. Многія пасля сталі брэндамі рэспублікі: Рагачоўскі малочнакансервавы камбінат, Быхаўскі агароднінаконсервавы, Добрушская папяровая фабрыка і іншыя. Гэта дазволіла стварыць рабочыя месцы, істотна скараціць беспрацоўе. Змянялася і Ляхаўка — за кошт аб'яднання невялікіх прадпрыемстваў у адно створаны скурзавод «Бальшавік», «Энергія», дражджавы завод «Чырвоная зара», прадмесце Мінска станавілася развітым прамысловым раёнам. Пры гэтым патрапіць у жорны рэпрэсій было рэальнасцю таго часу. Па ўспамінах старэйшай дачкі Грэкавай, у кватэры заўсёды стаяў чамаданчык на выпадак арышту, а пасля работы яны з Панамарэнкам часта дамоў не ішлі, а гулялі па Мінску да раніцы: арыштаваць маглі ў любы момант, але здавалася, што днём гэта не так страшна.

Пасля рэгістрацыі шлюбу генерал-палкоўнік Міхаіл Малінін і старшыня Вярхоўнага Савета БССР Надзея Грэкава. 3 мая 1944 года.

Вось толькі некаторыя вытрымкі з «Запіскі сакратара ЦК КП(б)Б П. Панамарэнкі кіраўніку Упраўлення кадраў ЦК ВКП(б) Г. Малянкову аб шкодніцтве ў кіраўніцтве рэспублікі. З ліпеня 1939 года»: «...у канцы 1937-га і пачатку 1938 года былі выключаны з партыі і па правакацыйных матэрыялах арыштаваны кіраўнікі партарганізацый: Бялыніцкага, Рудзенскага, Сенненскага, Бярэзінскага, Чэрвеньскага, Сірацінскага, Кармянскага і шэрагу іншых раёнаў, ...выключаны з партыі і зняты з работы 24 сакратары райкамаў, 33 сакратары райкамаў партыі былі зняты з накладаннем розных партыйных спагнанняў, каля 35 сакратароў райкамаў былі арыштаваны, ...зняты з работы і арыштаваны каля 50 старшынь райвыканкамаў».

Грэкава ж спрабавала разабрацца, дзе праўда, а дзе даносы. Лісты ёй ішлі адусюль, і ў народзе іх называлі «слязяніцамі». Пра давер сведчыў надпіс на канверце — замест адраса проста «Цёці Грэкавай», «Мінск, Грэкавай». Яна давала даручэнні самому Лаўрэнцію Цанаве. Як гэта яго раздражняла — адказы ён павінен быў накіроўваць на адрас нейкай жанчыны, ды яшчэ такой маладой. І людзей нярэдка апраўдавалі. Яна магла напрамую звярнуцца да Берыі, напрыклад, калі даносы датычыліся таго ж Панамарэнкі, і да меркавання баларускай партыйнай арганізацыі прыслухоўваліся. Гэта былі не проста ўчынкі, але і вялікая рызыка.

1939 год Грэкава назвала самым страшным у сваім жыцці. XVIII з'езд партыі асудзіў рэпрэсіі, і, здавалася, наступае новы перыяд. Грэкава, яго дэлегат, магла сама пераканацца ў гэтым, калі асабіста Сталін прыняў удзел у яе лёсе. Ішло галасаванне па складзе Цэнтральнай рэвізійнай камісіі ЦК ВКП(б): Берыя, Будзённы, Варашылаў... Нечакана Сталін папрасіў слова. Надзея Рыгораўна ўспамінала: «Сталін заўсёды гаварыў ціха. Ён падышоў да трыбуны і сказаў: «Я прапаную дапоўніць спіс — увесці ў склад Рэвізійнай камісіі таварыша Грэкаву». Пачуўшы з вуснаў Сталіна такую прапанову, я ледзь не ўпала з крэсла. Пасля ў маёй галаве пранеслася, што гэта не пра мяне ён гаворыць,

Але за прывабным вобразам стаяла жанчына з моцным характарам, якой давялося вырашаць далёка не жаночыя праблемы. Адны толькі пытанні эканомікі пасля ўваходжання Заходняй Беларусі ў склад БССР патрабавалі неверагодных намаганняў.

а пра кагосьці з падобным на маё прозвішчам. Заўважыўшы маю збянтэжанасць, Сталін рукой паказаў на месца, дзе я сядзела з Панамарэнкам, і сказаў: «Як, таварышы з Беларусі? Не пярэчыце?» Пасля завяршэння з'езда дэлегатаў папярэдзілі пра фатаграфаванне. Надзея Рыгораўна, пабегла ў цырульню рабіць прычоску, а тут высвятляецца, што Іосіф Вісарыёнавіч ужо выехаў і фатаграфаванне ссоўваецца, у зале спешна расстаўляюць крэслы, збіраюцца дэлегаты, па Грэкаву ў цырульню тэрмінова адправілі ад'ютанта. Сталін прыбыў, яму дакладваюць, што сабраліся ўсе, акрамя Грэкавай, і асцярожна дадаюць, што яна... у цырульні. Сталін да сітуацыі аднёсся з разуменнем. Прапанаваў усім рассаджвацца і пачакаць таварыша Грэкаву. Сама ж яна (нават цяжка ўявіць яе стан у такі момант!) паспрабавала незаўважна зайсці ў залу і ўладкавацца ў апошнім радзе. Але Сталін павярнуўся ў яе бок і запрасіў у першы рад.

Надзея Рыгораўна разбурала многія стэрэатыпы аб дзелавой жанчыне. Модныя перавагі таго часу: чырвоная хустка, скуранка — вопратка, якую гісторыкі моды пасля назавуць стылем канструктывізму. Ва ўсім прастата, лаканічнасць, гэткі шарм па-пралетарску. Да яго распрацоўкі былі прыцягнуты вядомыя мастакі і нават скульптары, над ім працавала сама Вера Мухіна, аўтар знакамітай скульптуры «Рабочы і калгасніца». Грэкава ж фарміравала свой стыль, гэта дзелавы касцюм, пра неабходнасць якога тады спрачаліся, але з элементамі, якія падкрэсліваюць жаноцкасць, — элегантны шалік, карункі, брошка.

«Куды паставіць памежны слуп?»

Але за прывабным вобразам стаяла жанчына з моцным характарам, якой давялося вырашаць далёка не жаночыя праблемы. Адны толькі пытанні эканомікі пасля ўваходжання Заходняй Беларусі ў склад БССР патрабавалі неверагодных намаганняў — тэрыторыя рэспублікі павялічвалася са 125,5 тысячы кв. км да 225,7, а колькасць насельніцтва вырасла ў два разы і склала 10 мільёнаў 200 тысяч чалавек. Гэта спачатку ўсё эмацыянальна: сесія Вярхоўнага Савета, дэлегаты ад усіх рэгіёнаў Заходняй Беларусі, яскравыя асобы, выступленні. Але не абышлося і без кур'ёзаў. «На трыбуну ўздымаецца вядомы ваеначальнік, — успамінала Надзея Рыгораўна. — У руках яго памежны слуп. Заканчваючы прамову, ён звярнуўся да мяне са словамі: «Таварыш старшыня Вярхоўнага Савета БССР, мяжа перанесена, куды загадаеце паставіць памежны слуп?» Вось так нумар. Я спачатку разгубілася вельмі, але пасля сабралася і стала даваць тлумачэнні. А работа сесіі трансліравалася па цэнтральным радыё. Таварыш сваю прамову скончыў яшчэ і лозунгамі: «Даеш Варшаву! Даеш Берлін! І заўтра ўрэжамся мы ў Рым!» Не прайшло і пяці хвілін, як Панамарэнку тэрмінова з прэзідыума выклікалі да тэлефона, званіў асабіста Сталін, які строга спытаў: «Што ў вас там адбываецца на сесіі? (Гэта супала з заключэннем дагавора СССР і Германіі аб ненападзенні.) Чаму такія заклікі?» Давялося даваць тлумачэнні».

Сітуацыю разрадзіла выступленне сакратара Мінскага абкама партыі, які вырашыў выступаць на беларускай мове. Тэкст быў

надрукаваны. Літары рускія, але, не ведаючы беларускай мовы, ён няправільна пачаў ставіць націск: «Беларускі народ 20 гадоў жыў пад прымусам». У зале раздаўся смех. Суцішаць зал зноў давялося Грэкавай. Пасля Матвеева так і празвалі — «прымус».

У эканоміцы было ўсё не так гладка — і супрацьстаянне, і непрыманне насельніцтвам шэрагу непапулярных мер новай улады, і сабатаж. Усё, што датычылася Заходняй Беларусі, — на кантролі асабіста Сталіна. Шыфроўкі, запіскі, многа даручэнняў наўпрост Грэкавай, сярод іх аб пераходзе на савецкую валюту, аб непапулярных мерах па нацыяналізацыі прамысловых прадпрыемстваў, а яшчэ банкі, чыгунка, медустановы, школы. Меры прымаліся аператыўна, але не ўсё рэгулявалася жорсткімі рэзалюцыямі. Напрыклад, пасля вызвалення Брэста мэр горада, паляк, закрыў доступ да ўсіх баз харчавання і заявіў, што ў горадзе няма ні хлеба, ні мяса, ніякіх харчовых запасаў. Сабралі тэміновае пасяджэнне, усе выдатна разумелі, што такога быць не магло, для размовы запрасілі мэра. На польскай мове ён здзекліва заяўляў, што заваявальнікам ні хлеба, ні мяса, ні вады не дасць. Перакладчык перакладаў не з яго слоў, а сам прыдумваў адказы, маўляў, хочам дапамагчы, але ўсе фонды і рэсурсы выдаткаваныя, рады б, але не можам». Але Грэкава добра ведала польскую мову, таму пасля чарговых «тлумачэнняў наконт складаной сітуацыі» папрасіла зрабіць перапынак, падчас якога сказала Панамарэнку, што з іх проста здзекуюцца. Можна толькі ўявіць стан палякаў, калі Грэкава па-польску ўсё растлумачыла даволі даходліва. Хутка былі адкрыты ўсе крамы, базы, склады, паступова нармалізавалася жыццё.

Узнагароды везла пад абстрэлам

Суровыя выпрабаванні прынесла вайна. Грэкава — сакратар Казанскага гаркама партыі. Як кавалі перамогу ў тыле, сведчаць прыклады. 19 ліпеня ў Казані ў яе адбылася першая сустрэча з акадэмікам Ота Шмітам, вядомым палярнікам, якому была даручана эвакуацыя навуковых устаноў, 23 ліпеня Казань ужо сустракала першыя эшалоны з людзьмі, абсталяваннем, а гэта 33 навуковыя ўстановы, 5 тысяч навуковых супрацоўнікаў Акадэміі навук СССР з сем'ямі, сярод іх 39 акадэмікаў, 44 члены-карэспандэнты, 17 НДІ з Масквы, Ленінграда, Прэзідыума Акадэміі навук СССР, Акадэміі навук Беларусі.

Ігар Курчатаў менавіта ў Казані пачынае работы па ядзернай праграме «Уран», па стварэнні ўранавай бомбы. І тут жа асабістыя праблемы, якія давялося вырашаць неадкладна, — сыпны тыф, які звалiў Курчатава пасля прыбыцця ў Казань. Сяргей Каралёў, Сяргей Вавілаў, які працаваў у Казані над стварэннем аптычных прыбораў для ўсіх відаў узбраення, Пётр Капіца — гэта далёка не поўны пералік выдатных вучоных, у вырашэнні праблем якіх непасрэдны ўдзел прымаў гаркам партыі. Да таго ж толькі ў кастрычніку ў Казань былі эвакуяваны адразу тры маторныя заводы з Варонежа і Масквы. Фронт меў вострую патрэбу ва ўзбраенні, людзі працавалі на знос. Толькі на адным Казанскім авіязаводзе № 22 за перыяд з 1941 да 1945 года было пастаўлена на крыло 10 174 самалётаў Пе-2, значыць, па 6 такіх баявых машын у суткі. Што датычыцца прадпрыемстваў, эвакуяваных з Беларусі, то ў жніўні—верасні 1941 года ўступіла ў строй 15 заводаў і фабрык. У кастрычніку—лістападзе — яшчэ 20. Да лета 1942 года абаронную прадукцыю выдавалі ўжо калектывы больш чым 70 беларускіх заводаў і фабрык. А яшчэ трэба вырашаць, як... накарміць сланоў, мартышак цырка Дурава, эвакуяванага ў Казань, на якіх харчовых картак не выпісалі, як размясціць тэатр аперэты, якога ў спісах на эвакуацыю не было. Давялося задзейнічаць рэзерв НКУС, артыстаў размясцілі ў ведамасным Доме культуры.

А яшчэ пастаянныя кантакты з беларусамі: арганізацыя сесіі Акадэміі навук у Казані, калі вучоных давялося збіраць па ўсім Саюзе, сувязь з паэтам Янкам Купалам, збор сродкаў для беларускіх партызан. Жыхары Казані прынялі рашэнне на працягу месяца працаваць на дзве гадзіны даўжэй і на атрыманыя сродкі купіць неабходныя для партызан рэчы — шапкі, целагрэйкі, валёнкі. Сама ж Грэкава імкнулася ў рэспубліку, і ў яе з'явілася такая магчымасць.

Як старшыня Вярхоўнага Савета БССР яна накіравалася на акупаваную тэрыторыю разам са старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Наталевічам і старшынёй Саўнаркама БССР Былінскім, каб асабіста ўручыць урадавыя ўзнагароды партызанам Суражскай зоны, хоць гэта можна было зрабіць і ў Крамлі. Да Калінінскага фронту ў іх распараджэнні быў транспарт, але гэта не ратавала ад абстрэлаў, налётаў фашысцкіх самалётаў. «У вялікіх трывогах і хваляваннях за захаванасць даверaных нам узнагародных дакументаў і ўрадавых узнагарод мы дабраліся да размяшчэння штаба Калінінскага фронту», — успамінала Грэкава. Адтуль з праваднiком

На мітынгу ў Мінску з нагоды ўз'яднання з Заходняй Беларуссю. Старшыня Вярхоўнага Савета БССР Надзея Грэкава і першы сакратар ЦК КП(б)Б Панцеляймон Панамарэнка. 1939 год.

у глыбокі тыл уначы, дзе паўзком, дзе лежачы ў яры, чакалі, калі пройдуць нямецкія калоны. У вёсцы Дабрыніна, дзе сабраліся работнікі Віцебскага абкама партыі, героі-партызаны Суражскай зямлі, ім былі ўручаны ўзнагароды. Першым з яе рук сваю першую ўзнагароду атрымаў Мінай Шмыроў (легендарны бацька Мінай). Надзея Рыгораўна чатыры разы хадзіла за лінію фронту, і кожны раз гэта была неймаверная рызыка.

У лістападзе 1943 года пасля вызвалення Гомеля Надзея Грэкава на чале ўрадавай камісіі вярталася ў Беларусь. Неабходна было не толькі ацаніць шкоду, але і пачаць аднаўленчыя работы, а яшчэ падрыхтоўку да сесіі Вярхоўнага Савета, першай на вызваленай тэрыторыі, якой надавалася асаблівае значэнне. Да пасады старшыні Вярхоўнага Савета БССР дадалася яшчэ адна — намеснік старшыні СНК. Гэтыя абавязкі яна выконвала да сакавіка 1947 года, фактычна ў самы складаны для рэспублікі час, калі ўсё рабілася па гарачых слядах, калі першай даводзілася ўваходзіць у спаленыя горад, у пакінуты фашыстамі канцлагер «Азарычы», аператыўна вырашаць задачы. Тады ж у штабе Беларускага фронту прагучаў тэлефонны званок са Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага. Званіў асабіста Сталін. Размова яго з камандуючым Ракасоўскім датычылася аказання дапамогі беларускай урадавай дэлегацыі ў падрыхтоўцы сесіі. У канцы Іосіф Вісарыёнавіч як бы незнарок дадаў: «Грэкава не замужам, а ў цябе начальнік штаба Малінін — удавец». З першым даручэннем усё было зразумела. А як быць з выкананнем другога? Для пачатку Малініна прызначылі адказным за аказанне дапамогі па падрыхтоўцы сесіі. Сам ён не мог зразумець, чаму, бо для гэтага існуе цэлы палітаддзел фронту, ды і як жа падрыхтоўка наступальнай аперацыі? Але ўсё змяніла першая сустрэча, Грэкава зрабіла на яго ўраганнае ўражанне, падрыхтоўкай сесіі ён зацікавіўся, пра што далажылі Ракасоўскаму, як і пра тое, што Малінін ёй не спадабаўся. Шлях да сэрца жанчыны аказаўся больш складаны, чым распрацоўка стратэгічнай аперацыі. Было ўсё: і прыгожы раман у лістах, і разгубленасць, і сітуацыя, калі здавалі нервы. У сакавіку 1944 года сесія прайшла паспяхова. Трансляцыю слухалі на фронце, у партызанскіх атрадах, яна несла надзею на хуткую перамогу. На ёй было прынята рашэнне аб стварэнні Народнага камісарыята замежных спраў Беларускай ССР. Упершыню пачаў работу і Народны камісарыят абароны Беларускай ССР. А Ракасоўскаму і члену Ваеннага савета Цялегіну пачалі дакладваць, што Малінін некуды перыядычна адлучаецца з размяшчэння штаба фронту. З мая 1944 года быў зарэгістраваны шлюб.

Каханне, кар'ера, рэпрэсіі...

А каханне, падобнае на сон, Надзея Рыгораўна і Малінін пранеслі праз гады. Пасля рэгістрацыі шлюбу, яны раз'ехаліся па розных напрамках: перад кожным стаялі складаныя задачы. Для Міхаіла Сяргеевіча пачалася наступальная аперацыя, якая ўвайшла ў гісторыю пад назвай «Багратыён», для Грэкавай — гэта аднаўленне рэспублікі. Яшчэ ішла вайна. Аднаўлялі краіну неймаверныя намаганні: не было практычна спецыялістаў, проста людзей, калі ў ЦК ішлі тэлеграмы пра тое, што ў некаторых вёсках засталося на некалькі чалавек, і гэта ва ўмовах, калі гітлераўцы працягвалі здзяйсняць налёты, у сталіцы дзейнічалі ўзброеныя групы немцаў, якія не паспелі пакінуць горад, і тых, хто спецыяльна быў пакінуты для арганізацыі дыверсій. Пра сітуацыю можна меркаваць па запісцы Панамарэнкі на імя Малянкова і Берыі: «Мушу паведаміць, што будынак Дома ўрада ў Мінску два разы падпальваўся і быў выпадак пранікнення ў будынак ЦК тэрарыстычных элементаў. З прычыны засмечанасці варожымі элементамі і нямецкімі агентамі, наяўнасці бандытызму ў шэрагу раёнаў, а таксама перакідвання немцамі на тэрыторыю Беларусі тэрарыстычных груп, у выніку выпадкаў, калі праведзены тэрарыстычныя акты ў адносінах партыйных і савецкіх работнікаў, прашу дазволіць 6-му аддзелу НКУС узмацніць ахову».

Першыя пасяджэнні ўрада недзе выклікаюць здзіўленне, вакол разруха, а на парадку дня пытанні кінастудыі, «Аб аднаўленні дзейнасці Акадэміі навук і Белдзяржуніверсітэта», «Аб аднаўленні дзейнасці Саюза савецкіх кампазітараў і пісьменнікаў», «Аб аднаўленні і рабоце тэатраў Беларусі» і «Аб аднаўленні музеяў, бібліятэк, выдавецтваў». На кантролі ў Грэкавай пытанні і культуры, і эканомікі, і збор матэрыялаў аб злачынствах супраць чалавецтва. А сітуацыя ў горадзе страшная, вось толькі некаторыя вытрымкі з пратаколаў: «Цалкам дэзарганізавана санітарная ачыстка і каналізацыя», «знішчана камунальная гаспадарка, выведзена са строю водаправодная сетка, узарваныя рэзервуары і напорныя вежы», а гэта немінучы

На прыёме ў штабе Групы савецкіх акупацыйных войскаў у Германіі *(злева направа):* генерал-палкоўнік М. Малінін з жонкай Н. Грэкавай, Маршал Савецкага Саюза Г. Жукаў. Берлін, лістапад 1945 года.

шлях да эпідэміі. «Цалкам спынены гарадскі транспарт, гарадскога жылля знішчана больш за 70 працэнтаў». У першыя месяцы было зроблена немагчымае: у ліпені 1944 года аднавіў работу прыборабудаўнічы завод, у жніўні — мотарамонтны, восенню — аўтазборачны, з 1946-га — аўтамабільны, у лістападзе — Мінскі кіслародны завод «Тэрмапласт»...

Малінін у Берліне, ён — кіраўнік штаба акупацыйных войскаў у Германіі. Грэкава пры першай магчымасці прыязджала на некалькі дзён, была відавочцам закулісся многіх падзей: падрыхтоўкі Патсдамскай канферэнцыі, змены вектара адносін яшчэ нядаўніх саюзнікаў, і таго, як вядомыя палкаводцы радаваліся Перамозе. Жукаў часта ладзіў вечарыны ў сябе дома, у той час ён усміхаўся і быў вясёлым, гасцінным, іграў на гармоніку, часам спяваў. Такім яго больш не бачылі ніколі. Малінін, які меў прыемны барытон, дуэтам выконваў арыі з артыстамі Вялікага тэатра Беларусі, якіх запрасілі ў Берлін на першыя пасляваенныя гастролі.

На долю Грэкавай прыйшоўся, відаць, самы складаны перыяд савецкай гісторыі — 30—50-х гадоў, калі ствараласа фактычна з нуля прамысловасць, фарміравалася сістэма кіравання, нарошчваўся культурны патэнцыял рэспублікі, і практычна перманентна ішлі рэпрэсіі.

Калі Малінін рабіў усё, каб у рэспубліку аператыўна па рэпарацыях дастаўлялася абсталяванне для прамысловых прадпрыемстваў, сельскай гаспадаркі, за што Панамарэнка называў яго «наш беларускі зяць», Надзея Рыгораўна з Германіі прывозіла ўзоры тканін, нітак, так неабходнага шырспажыву, кандытарскіх вырабаў, апошнія часопісы мод. З 1947-га — яна міністр харчовай прамысловасці БССР, і зноў складаны ўчастак, калі трэба было пераадольваць голад, фактычна ствараць галіну з чыстага ліста. Многія навінкі харчовай прамысловасці былі падгледжаны ў гэты час. Знакамітая двухпавярховая скрынка для прысмакаў, шакаладныя бутэлечкі, яскравыя абгорткі, абсталяванне для іх друку. І ўсё гэта на фоне новага вітка рэпрэсій. У Беларусі працуе камісія парткантролю ЦК на чале з Мацвеем Шкіратавым — у спустошанай рэспубліцы шукалі карупцыю, якая атрымала назву «каровіна справа», калі скаціну, атрыманую па рэпарацыі, выдзялілі ў тым ліку і міністрам, кіраўнікам абласцей і раёнаў — страшэнны дэфіцыт па тых часах давялося вяртаць. Паказальным у гэтым плане было студзеньскае пасяджэнне ЦК Кампартыі Беларусі 1946 года, калі Панамарэнка зрабіў разнос яго членам, што «папрыбіраліся ў барахло з гуманітарнай дапамогі».

Для Надзеі Рыгораўны гэта быў адказны перыяд — удзел у перагаворах у Празе, калі ішла барацьба за саюзнікаў, якія не прамінулі гандлявацца за эканамічныя прэферэнцыі, толькі Чэхаславакія мела 60 % эканомікі, арыентаваная на Захад, і краіну патрабавалася ўтрымаць прывабнымі прапановамі, а Грэкава мела вопыт перагаворшчыка. Выступленне ў Парыжы на французскай мове і аўтарытэт, навязденне мастоў праз міжнародны жаночы рух. Але яе імклівая кар'ера не давала некаторым спакою. Яе і Малініна не чапалі ні ў 30-х, ні ў 40-х, але Грэкава разумела, што не існуе недатыкальных, калі ў пачатку 50-х пачаўся новы віток рэпрэсій. Каб адвесці бяду ад сям'і, ад Малініна, героя вайны, начальніка штаба пяці франтоў, які прымаў удзел у распрацоўцы асноўных бітваў вайны — пад Масквой, Курска-Арлоўскай, «Багратыёна», Вісла-Одэрскай, Берлінскай, Надзея Рыгораўна сама падала ў адстаўку. Падстава — такая папулярная пры змяшчэнні непажаданых — па стане здароўя.

Але Надзея Рыгораўна яшчэ доўгія гады заставалася ў страі, праводзіла вялікую грамадскую работу сумесна з Усесаюзным саветам ветэранаў, з кіраўніцтвам Беларусі, пра што сведчаць шматлікія падзячныя лісты, тэлеграмы ад Машэрава, Кісялёва, Кавалёва і іншых, першага Прэзідэнта ўжо незалежнай Беларусі. Надзея Грэкава адносілася да людзей з моцным унутраным стрыжнем, якія не пасавалі перад абставінамі, цяжкасцямі, працавалі на карысць краіны і яе дабрабыту.

Наталля ГОЛУБЕВА,
кандыдат гістарычных навук.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению РУП «Минская Фармация» (продавец) проводит открытый аукцион

по продаже права заключения договора аренды здания аптеки

(инв. № 611/С-10579)

Характеристики объекта	**здание специализированное здравоохранения; предоставление социальных услуг; одноэтажное сборно-щитовое, обложенное кирпичом**
Местонахождение объекта	Минская область, Березинский район, Погостский с/с, д. Погост
Общая площадь, кв. м	73
Срок договора аренды	1 год
Начальная цена права заключения договора аренды, бел. руб.	308,43
Сумма задатка, бел. руб.	30,84
Размер ежемесячной арендной платы за сдачу в аренду Объекта	8,76 базовой арендной величины в месяц
Условия (при наличии) продажи Объекта аукциона	Сдача в аренду для розничной торговли

Базовая арендная величина с 01.04.2020 составляет 17,85 бел. руб. В соответствии с подпунктом 2.1 пункта 2 Указа Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 № 150 «О некоторых вопросах аренды и безвозмездного пользования имуществом» размер базовой арендной величины ежегодно устанавливается Советом Министров Республики Беларусь с учетом изменения индекса потребительских цен за предыдущий год по отношению к предшествующему и применяется с 1 апреля года, в котором он установлен.

Задаток в размере 10 % от начальной цены объекта перечисляется на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан перечислить арендодателю сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение.

Договор аренды имущества должен быть заключен в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона регламентирован Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049, а также иными актами законодательства. Аукцион состоится **21.10.2020** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **20.10.2020** до **16.00** по указанному адресу.

Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17, сайт в сети интернет: www.rlt.by.

УНП 600013211

Центр Промышленной Оценки
- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**ОАО «МЗАЛ им. П. М. Машерова», г. Минск, ул. Долгобродская, 18 (+ 37517 348 89 88)**

Предмет аукциона
Месторасположение: г. Минск, ул. Долгобродская, 18

Наименование (назначение)	Общая площадь	Инвентарный номер	Адрес (№ дома)
Лот № 1			
Литейный цех (здание специализированное для металлургического производства и металлообработки)	10546 кв. м	500/С-52784	18/8
Дополнительная информация: в состав лота не входит оборудование ЦРП, установленное в отдельном помещении литейного цеха. Полный перечень на сайте организатора аукциона			
Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 4 268 160,00 бел. руб. (снижена на 5 %)			
Лот № 2			
Модельный цех со складом моделей (здание специализированное для производства машин и оборудования (машиностроения))	4293 кв. м	500/С-10091	18/13
Корпус очистных сооружений (сооружение специализированное водохозяйственного назначения)	2881 кв. м	500/С-47411	18/12
Обременения: площади модельного цеха со складом моделей частично сданы в аренду. Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона			
Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 2 819 220,00 бел. руб. (снижена на 5 %)			

Сведения о земельном участке по всем лотам: пл. 19,3873 га предоставлен на праве общего долевого постоянного пользования (доля: 19/20). После продажи земельный участок будет разделен в долях с установлением сервитута

Задаток 1 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60LBBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**30** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 16.07.2020

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Аукцион состоится 29.09.2020 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 28.09.2020 до 17.00** по указанному адресу

Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Слуцкая фабрика пошива одежды» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже:

Лот № 1: административное здание *(составные части и принадлежности: склад)*, **инв. № 640/С-27207, общей площадью 318,7 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 624650100001008501 (право аренды по 07.04.2041) площадью 0,1063 га по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. Уласовца, 3.**

Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона сетей и сооружений теплоснабжения, пл. 0,0207 га.

Начальная цена с НДС (20 %) – **239 316,00 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **23 931,60 бел. руб.**).

Лот № 2: здание торгового центра «Калейдоскоп», инв. № 640/С-27200, общей площадью 1 022,6 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 624650100001009010 (право аренды по 07.04.2041) **площадью 0,0974 га по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. Уласовца, 3.**

Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона сетей и сооружений теплоснабжения, пл. 0,0123 га.

Начальная цена с НДС (20 %) – **845 376,00 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **84 537,60 бел. руб.**).

Лот № 3: комбинат бытового обслуживания *(составные части и принадлежности: 2 пристройки)*, **инв. № 640/С-37673, общей площадью 1 112,9 кв. м, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 624650100001006778** (право постоянного пользования) **площадью 0,0781 га по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. Ленина, 183.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **641 520,00 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **64 152,00 бел. руб.**).

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИКBPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере: по лоту № 1 – 4 (четырех) процентов, по лотам №№ 2, 3 – 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.** Аукцион состоится **20.10.2020 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 19.10.2020 до 16.00** по указанному адресу.

Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17.

УНП 600154407

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ХИМРЕМОНТ» (продавец)

Лот № 1, состав:

1. Здание административно-хозяйственное, инв. № 500/С-65858, 560 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Асаналиева, 84/6.

2. Тепловая сеть с инвентарным номером 500/С-1026994. Адрес: г. Минск, ул. Асаналиева, 84/2 (ЦТП-здание, ул. Асаналиева, 84/2).

Земельные участки: 1. Здание административно-хозяйственное (инв. № 500/С-65858) расположено на земельном участке площадью 0,0684 га с кадастровым номером 500000000004006410. Право постоянного пользования. 2. Тепловая сеть (инв. № 500/С-1026994) расположена на земельном участке с кадастровым номером 500000000004006332 (присвоен, предварительно). 3. Земельный участок площадью 0,0683 га с кадастровым номером 500000000004006411. Право постоянного пользования. Начальная цена с НДС – 306 802,80 бел. руб. Задаток – 30 000,00 бел. руб.

Аукцион состоится 20.10.2020 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4. Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Организатора аукциона **ino.by**.

☎ Организатора аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Веста-Борисов» (арендодатель) проводит открытый аукцион по продаже права заключения договора аренды:

Наименование объекта	**Изолированное нежилое помещение административного здания, расположенное на 1-м этаже**
Адрес объекта	г. Борисов, ул. Почтовая, 50
Общая пл., кв. м	373,8
Срок заключения договора аренды	3 года
Начальная цена права заключения договора аренды	1 579,31
Сумма задатка	157,93 бел. руб.
Размер ежемесячной арендной платы	280,35 БАВ
Целевое использование имущества	Для размещения офиса, организации торговли непродовольственными и (или) продовольственными товарами с возможностью использовать части помещения под склад
Условия	Уборка прилегающей территории

Базовая арендная величина с 01.04.2020 составляет 17,85 бел. руб. В соответствии с подпунктом 2.1 пункта 2 Указа Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 № 150 «О некоторых вопросах аренды и безвозмездного пользования имуществом» размер базовой арендной величины ежегодно устанавливается Советом Министров Республики Беларусь с учетом изменения индекса потребительских цен за предыдущий год по отношению к предшествующему и применяется с 1 апреля года, в котором он установлен.

Задаток в размере 10 % от начальной цены объекта перечисляется на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

